Здольнасці і вучоба ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Дружба народаў ☞ 5

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 15 (2761) Год LIV | Беласток, 12 красавік 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Жыве Беларусь на Памор'і!

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Гданьск, 28 сакавіка.

Гарнізонныя могілкі.

Ля магілы Лукі Дзекуць-Малея (1888-1954) сабралася роўна 25 чалавек. Праўнук змагара за БНР, ліцэіст Лукаш Лабендзкі стаў найбліжэй помніка з бел-чырвона-белым сцягам. Вясновае паветра, прасякнутае радасным спевам жаўранкаў, напаўняла пачуццём лёгкасці, свабоды. З беларуска-беластоцкай перспектывы ўся сітуацыя выглядала неверагодна. І не толькі таму, што імем Лукаша Дзекуць-Малея названа ў Гданьску вуліца. І што над магілай беларускага патрыёта сабраліся прадстаўнікі многіх канфесій, прафесій і пакаленняў. Вось, чарговы раз, грамаду і ідэю незалежнай Беларусі павіншавалі ўлады горада Гданьска. Віцэ-прэзідэнт горада Мацей Лісіцкі ўсклаў на магіле бел-чырвона-белыя кветкі і паабяцаўся прафінансаваць музычны запіс беларускіх патрыятычных песень у выкананні калектыву даўняй музыкі „Cappella Gedanensis".

— Мы таксама гатовы прафінансаваць другі том успамінаў Эдварда Вайніловіча, — прапанаваў віцэ-прэзідэнт Гданьска.

Святкаванне наведаў пастар Роберт Мікса, які гаварыў пра значэнне беларускага перакладу Евангелля, які падарылі беларусам Дзекуць-Малей з жонкай Серафімай. І дадаў:

— Ён запамятаўся сярод нашай грамадскасці як вельмі добры чалавек.

Сустрэча на могілках не звялася да сімвалічных жэстаў і прамоў. Далейшы ход святкаванняў паплыў у бок успамінаў. Голас даверылі д-р Лене Глагоўскай. Яе аповеды пра пошукі сямі'і мастака Кузьмы Чурылы часам напаміналі сцэнарыі сенсацыйных фільмаў. Бо апрача магіл баптысцкіх асветнікаў, грамада перайшла да магілы жывапісца Кузьмы Чурылы. Тут таксама ўсклалі кветкі і запалілі лампадкі.

* * *

Далейшае святкаванне таксама адбывалася на прыродзе ў Гданьску-Аліве, дзе стаіць камень у гонар Янкі Купалы. Беларускі пясняр дачакаўся і сваёй вуліцы. На беларускую грамаду, якая чытала вершы, спявала песні паэту з цікавасцю сачылі жыхары вуліцы Янкі Купалы, якія гулялі па квартале са сваімі пародзістымі сабакамі.

— Купала ведаў куды папасці! — пажартавала мая знаёмая.

Месца, у якім знаходзіцца помнік, вабіць прыгажосцю і заахвочвае спыніцца. Побач каменя — сажалка і старая вярба.

— І хочам пасадзіць тут явар і каліну, — дадае Лена Глагоўская.

Сустрэча ля каменя таксама напоўнілася жывымі ўспамінамі. Вечна малады Мацей Канапацкі, былы журналіст „Нівы", распавёў пра сяброўства Купалы і ягонага бацькі Гасана Канапацкага. Паэт наведваў іх дом у даваеннай Вільні, чытаў вершы, гутарыў пра беларускую літаратуру. Гэта паўплывала на жыццёвыя выбары Мацея.

— Калі я вучыўся ў Варшаве, мы з сябрамі заснавалі гурток аматараў беларускай мовы імя Янкі Купалы. Гэта было яшчэ да ўзнікнення беларускай філалогіі...

Жывы пераказ памяці пакаленняў мае сваю моц, якая праявілася і ў далейшым ходзе мерапрыемства. Тут трэба сказаць, што асноўную частку гданьскіх святкаванняў займаюць культурныя мерапрыемствы: вернісажы, канцэрты, аўтарскія сустрэчы. У гэты раз арганізатары прапанавалі аўтарскія прэзентацыі навейшага тома паэзіі Міхася Куптэля „Разлады". У зборніку вершы на польскай і беларускай мовах (пераклад Віктара Шведа), які наш карэспандэнт выдаў на ўласны кошт. „Разлады" Міхася Куптэля — рарытэт у сэнсе зместу і ліку, тыраж зборніка ўсяго... 20 асобнікаў. Разам прэзентавалася „Царская трызна" ніжэйпадпісанай. Сустрэчу са смакам павяла вядомая журналістка Радыё Гданьск Анна Сабэцкая. Прэзентацыі адбываліся ў Тэатры-атэлье імя Агнешкі Асецкай у Сопаце. Аўтарскія чытанні і гарачыя гутаркі, падмацаваныя ўспамінамі Бацькаўшчыны, працягваліся ў час вячэры, якую кожны год на заканчэнне сьяткаванняў ладзіць таварыства „Хатка".

Гданьскія беларусы ля магілы Кузьмы Чурылы

Лена Глагоўская — старшыня „Хаткі" і Мацей Канапацкі ля помніка Янку Купалу

Хрыстос Уваскрос! Шчаслівага Вялікадня нашым Чытачам, якія Пасху святкуюць па новаму стылю жадае

„Ніва"

Маральныя аўтарытэты ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Зусім здрабнелі сучасныя палітыкі. Не ростам зразумела, хоць, прыкладам, Расіі тут зноў не шанцуе — да ўлады прыйшлі якраз маларослыя, а гэта для вялізнай і бяскрайняй краіны заўсёды бяда (згадайма хоць бы Леніна ці Сталіна). Сярод афіцыйных лідараў розных краін нат не праглядваюцца асобы, здольныя выклікаць захапленне і нават глыбокую павагу....

Віктар Швед усё здзіўляе! ☞ 2

Ганна КАНДРАЦЮК

Калі б у нас не было Віктара Шведа, яго абавязкова трэба было б прыдумаць. Гэты вечна малады, дзейсны, наздзіў плённы аўтар і перакладчык усё здзіўляе. І толькі пры нагодзе юбілеяў мы ўсведамляем, што паэту за восемдзесят, што на літаратурнай ніве ён больш за семдзесят гадоў і, як сам пералічвае ў вершы „Мае айчыны", не з'язджаючы за мяжу быў грамадзянінам пяці дзяржаў...

Тут будзе манастыр ☞ 12

Міра ЛУКША

Ганна Бандарук

9 770546 196000

Маральныя аўтарытэты

Зусім здрабнелі сучасныя палітыкі. Не ростам зразумела, хоць, прыкладам, Расіі тут зноў не шанцуе — да ўлады прыйшлі якраз малаарослыя, а гэта для вялізнай і бяскрайняй краіны заўсёды бяда (згадайма хоць бы Леніна ці Сталіна). Сярод афіцыйных лідараў розных краін нат не праглядваюцца асобы, здольныя выклікаць захапленне і нават глыбокую павагу. Глядзіш на ўсе гэтыя саміты васьмёрак, сустрэчы дваццатак ды іншых міжнародных фарматаў і здзіўляешся — наколькі яны, гэтыя лідары, падобныя адзін на другога. Не, не колерам скуры, ростам ці камплекцыяй. Падобныя яны сваёй шэрасцю, трафарэтнасцю, запраграмаванай прадказальнасцю, калі гаворыцца адно, думаецца другое, а робіцца трэцяе, альбо зусім нічога не робіцца. Дэмагогія і папулізм — асноўныя рысы амаль усіх буйных палітыкаў. Вось і ў Амерыцы выбралі Барака Абаму, які гаворыць тое, што хочуць ад яго пачуць. Папулярныя рашэнні абвяшчае пры шырокім скліканні медый, усяляк, як кажуць, „піярыцца". А спрэчныя і непапулярныя прымае келейна, нібы схаваўшыся (прыкладам, пастанову аб фінансаванні міжнародных адукацыйных праграм, скіраваных па-сутнасці на павелічэнне абортаў). А ў прынцыповых міжнародных пытаннях усё больш нагадвае еўрапейскіх палітыкаў, меркантыльных і разліковых. Словам, раней пра Абаму маглі б сказаць — „самая выдатная пасрэднасць нашых дзён".

З іншага боку, кіраўнікі дзяржаў нязгодныя нават на традыцыйныя дыпламатычныя паставы і выкананне міжнароднага пратакола захоўвання. Уладар Беларусі паўсюдна цягае за сабой малалетняга сына — генералы аддаюць яму чэсць, і нават на сустрэчах у вярхах гэтае няшчаснае дзіця сядзіць бы паўнацэнны ўдзельнік перамоў. Але і на захадзе не лепей. Жонка Абамы, зусім не ведаючы этыкету, у Лондане дазваляе сабе паляпаць па плячы брытанскую каралеву, а італьянскі прэм'ер Сільвіа Берлусконі, публічна вітаючы новага прэзідэнта ЗША, голасна крычыць, што выклікала досыць шчырыя здзіўленні той жа Елізаветы. Ёй, каралеве Елізавеце II, напэўна цяжка асэнсаваць сучасныя рэаліі, бо яна з той эпохі, калі і дрэвы і палітыкі яшчэ былі вялікімі.

Вось каталікос усіх грузінаў Ілья — сапраўдны маральны аўтарытэт для свайго народа. Заклікаў патрыярх грузінскія сем'і да нараджэння трэцяга дзіцяці ў сям'і, якое ён абяцаецца хрысціць асабіста. І адразу ў краіне, змучанай звадамі палітыкаў, лакальнымі войнамі і знешняй расійскай агрэсіяй, пайшоў дэмаграфічны ўздым. А што ў нас? Мітрапаліт Філарэт, кіраўнік буйнейшай у краіне канфесіі, сустракаецца з кіраўніком дзяржавы і прапаноўвае пераймаць кітайскі досвед у галіне фільтрацыі інтэрнэту. Так і карціць запытацца ў шаноўнага іерарха, няўжо яму невядома, на што найперш скіравана кітайская палітыка рэгулявання сусветнага павуціння? І ці гэта тая сфера, якая мусіць найперш хваляваць галаву мясцовай Праваслаўнай царквы?

Сапраўдным маральным аўтарытэтам у апошні перыяд існавання СССР быў акадэмік Андрэй Сахараў. Пасля яго чалавека такога роўню ў Расіі і блізка няма. Аляксандр Салжаніцын быў вялікім змагаром з камунізмам, але ўзняцца вышэй свядомасці сярэднестатыстычнага расійскага шавініста, вышэй імперскага мыслення ў дачыненні да суседніх народаў так і не здолеў. Чаго варты толькі ягоны сумнавядомы опус, дзе ён называў Казахстан „подбрюшьем", раздаваў падобныя характарыстыкі іншым суседзям.

Польскую салідарнасць у цяжкі для нацыі час кшталтаваў папа Ян Павел II, роля Касцёла была тады ці не першаснай. У Беларусі сумленнем нацыі бясспрэчна была Ларыса Геніюш, вялікая паэтка і грамадзянка. Пасля таго, як яе не стала, па вялікім рахунку гэтае месца застаецца дагэтуль вакантнае. Няма такога вялікага маральнага аўтарытэта. Можа таму і не праглядваецца пакуль нацыянальны палітычны лідар. Адзін адукаваны і інтэлігентны, другі бескампрамісны, трэці ў значнай ступені спалучае гэтыя рысы, чацвёрты валодае іншымі талентамі. Але нікога з іх і блізка не назавеш тым маральным арыенцірам, які можа ўплываць на тысячы людзей і тым больш павярнуць лёс нацыі ў бок катарсісу.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Віктар Швед усё здзіўляе!

Калі б у нас не было Віктара Шведа, яго абавязкова трэба было б прыдумаць. Гэты вечна малады, дзейсны, наздзіў плённы аўтар і перакладчык усё здзіўляе. І толькі пры нагодзе юбілеяў мы ўсведамляем, што паэту за восемдзесят, што на літаратурнай ніве ён больш за семдзесят гадоў і, як сам пералічвае ў вершы „Мае айчыны", не з'язджаючы за мяжу быў грамадзянінам пяці дзяржаў... Больш за сорак гадоў Віктар Швед правёў у Варшаве, дзе закончыў тры факультэты, працаваў у выдавецтве „Książka i Wiedza", актыўна дзейнічаў у беларускім грамадска-культурным руху.

— Ён не вярнуўся ў Беласток як пенсіянер, — пажартавала Міра Лукша, — ён вярнуўся да нас, каб выдаць свой найлепшы твор: дачку Наталлю.

Міра Лукша, якая з адчуваннем і свабодай вяла аўтарскую сустрэчу, наладжаную 18 сакавіка г.г. у Ваяводскай бібліятэцы ў Беластоку, прымеркаваную да 84-годдзя з дня нараджэння паэта, сказала больш, чым сказала. Віктар Швед з'ехаў у Беласток у 1990-х гадах, у пачатку новага беларускага адраджэння. Дачушка Наталля не толькі муза („Вершы Натальцы" — першы ў беларускай літаратуры зборнік паэта, прысвечаны свайму дзіцяці). Яна адкрывае дарогу ў дзіцячы і моладзевы свет і тым самым адчыняе новы этап у творчасці аўтара. Паралельна з гумарыстычнай дзіцячай творчасцю нараджаюцца рэфлексіўныя творы аб прамінанні і месцы чалавека на зямлі. Маладых не здзіўляе, што вершы беларускага паэта можна чытаць на рэкламных экранах у гарадскіх аўтобусах Беластока, побач з іншымі вядомымі літаратарамі. Віктар Швед для маладых, як і для нас крыху старэйшых, паэт вечна малады, жывы, дзейсны. Усе пераклады на польскую мову (а іх чатыры зборнікі) паэт, не чакаючы дапамогі, зрабіў сам. Хоць у сваім жыцці наведаў амаль усе нашы вёскі і мястэчкі ды правёў за тысячу аўтарскіх сустрэч, зараз найбольш зацікаўлены ім Беласток. У прыватнасці, беларускім паэтам цікавіцца маладое, у вялікай меры польскамоўнае, пакаленне. І, самае цікавае, яны выбіраюць вершы не для дзяцей, якімі ганарыцца наша літаратура, толькі вершы для дарослых, часта зафарбаваныя сумам прамінання і смерці:

— У вершах Віктара Шведа я знаходжу блізкія сабе вобразы, — кажа Рафал Цыбулька з III Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку. — Гэта свет маіх дзядоў, пакінуты на адміранне. Я адчуваю, што гэты свет таксама мой, што ў мяне эмацыянальная сувязь з пакінутымі прадметамі, пратаптанымі сцежкамі...

Рафал разам са сваімі сяброўкамі з ліцэя Барбарай Сіверскай і Наталляй Кандрацюк-Свярубскай выступілі з падборкай вершаў на польскай і беларускай мовах. Іх прэзентацыя спадабалася з-за арыгінальнай падборкі („Памідоры", „Цягнік", „Ружы", „Miłość prawdziwa", „Калісьці быў гаспадаром"), мастацкага выканання і асабістых рэфлексіяў на тэму падабраных імі твораў. Запланаваная на гадзіну сустрэча расцягнулася ў часе. І як адзначылі арганізатары, не падвяла шырокая публіка з прадстаўнікамі некалькіх пакаленняў.

— Віктара Шведа ведаю ад заўсёды, — кажа 17-гадовая ліцэістка. — Я люблю яго сустрэчы. Тут побач вершаў плывуць мудрыя апавяданні-расказы пра сапраўднае жыццё. У такія хвіліны я адчуваю, што лёсам і рукой паэта кіруе Бог.

Фота Ганны Кандрацюк

Запамяталіся і словы Міры Лукшы, пад якімі я сама магу падпісацца дзвюма рукамі:

— Гэта першы жывы паэт, якога я пабачыла ў сваім жыцці! Ён прыехаў у нашу школу і здзівіў усіх. Паказалася, што вершы можна пісаць на нашай простай, хатняй мове. Гэта быў пазітыўны шок, пасля якога я набралася смеласці пісаць па-беларуску...

І гэта не ўсё! На свае 84 угодкі Віктар Швед падарыў нам новы зборнік вершаў для дзяцей „Смяшынкі", чатырнаццаты ўжо па ліку том аўтара.

Ганна КАНДРАЦЮК

Вачыма еўрапейца

Хітрыкі. Выкрутасы?

Больш за дзесяць гадоў таму, працуючы ў адной з папулярных польскамоўных газет, трапіў я на г.зв. гіт. У прынцыпе я павінен сказаць: навёў на яго мяне (па вядомых толькі для сябе прычынах) адзін з тагачасных уплывовых палітыкаў (сёння сур'ёзны бізнесмен не звязаны з палітыкай). Справа была ў ліпных даравальных запісах у шпіталях, значыць, прыманне дырэкцыямі цэнтраў аховы здароўя медычнага абсталявання. Мелася яно перадавацца задарма, а канчаткова аказвалася, што шпіталі мусілі плаціць. Пасля артыкулаў на гэтую тэму паляцелі галовы. Былі адкліканы замешаныя ў справу шэфы шпіталяў з Беласточчыны (бо гэтага рэгіёна датычыла афёра); дарэчы, мала хапала, каб у адстаўку пайшоў міністр здароўя. Калі я яшчэ — як кажуць у журналісцкім асяроддзі — цягнуў тэму, спрабаваў дамовіцца на сустрэчу з беластоцкім ваяводам, дарэчы, лекарам па прафесіі. Я хацеў спытацца ці ведаў ён аб гэтых даравальных запісах. Пазбягаў ён мяне як агню; ведаў, чаго я ад яго хачу. Званіў я яму бесперапынна і выстойваў шмат разоў пад ягоным кабінетам у Ваяводскай управе, прабуючы яго злавіць і заспець з пытаннямі. На канец мусіў у адным з артыкулаў напісаць: „З ваяводам не ўдалося нам скантактавацца". Праз пару гадоў, калі справа ліпных даравальных запісаў была да канца „выэксплуатаваная", а ў Польшчы змянілася ўлада, настаў іншы ваявода — падляшскі (было гэта пасля ўвядзення рэформы публічнай адміністрацыі), на адной з сустрэч, на якой я быў службова, падышоў да мяне праследаваны мною былы ўжо ваявода:

— Пан Мацек, прашу прабачэння, што я так тады перад вамі ўцякаў. Калі б я вам сказаў, што ведаў пра тыя даравальныя запісы, мае начальнікі і прэса мяне б зжэрлі. Я быў бы тады, зразумела, сувіноўнікам. А калі б заявіў, што не ведаў аб гэтым, было б тое самае. Урэшце ж нагляд над шпіталямі быў маёй задачай. Гучна папракнулі б мяне ў тым, што я не дапільнаваў нагляду.

Гэты ваявода ўтрымаўся быў на сваёй пасадзе да канца тэрміну.

Прыгадалася мне гэтая гісторыя нядаўна, калі як журналіст „Нівы" прабаваў я скантактавацца з маршалкам Сейма Браніславам Камароўскім. Пачаў я дзеянні праз яго сеймавага прэс-сакратара. Хацеў, каб маршалак, другая пасля прэзідэнта асоба ў дзяржаве, адказаў мне на пяць пытанняў: як ацаняе рашэнне міністраў замежных спраў Еўрасаюза аб працягу спынення санкцый у адносінах да Беларусі, якіх крокаў у найбліжэйшы час павінна чакаць Польшча і шырэй ЕС ад беларускага боку, ці ў сувязі з адмарожваннем кантактаў з Беларуссю польскі Сейм таксама павінен наладзіць кантакты з адпаведнай яму ўстановай у Беларусі і ці ёсць магчымасць запрашэння беларускіх парламентарыяў у польскі Сейм, ці павінна ўзнікнуць у Сейме парламенцкая польска-беларуская група і якімі магчымымі пытаннямі мела б яна займацца, ці маршалак гатовы быў бы сустрэцца са сваім беларускім калегам у польскім парламенце. Выслаў я гэтыя пытанні на інтэрнэтны адрас прэс-сакратара пана маршалка. Прыскорваў. Прыпамінаючыся ў чарговы раз, пачуў у тэлефоннай трубцы:

— *Przekazałem pańskie pytania panu marszałkowi. Dojrzewa pan w kolejce.*

Незалежна ад таго, што мінуў ужо законны тэрмін, у якім органы ўлады абавязаны даць адказ журналісцкай дапытлівасці, адказу на свае пытанні я не пачуў. „Не даспеў". І толькі з-за нейкай прычыны прыгадаліся мне мінулыя паводзіны былога беластоцкага ваяводы ў справе маіх пытанняў пра ліпныя даравальныя запісы.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Здольнасці і вучоба

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы імя Яраслава Кастыцэвіча — ад нядаўна самая вялікая па ліку дзетак падставовай школы і моладзі гімназічнага ўзросту школа ў Бельску-Падляшскім. Хаця славутая „тройка" з'яўляецца безакруговай школай, бацькі з Бельска, а нават і навакольных сёл, ахвотна пасылаюць у яе сваіх дзетак, якія ўжо з першага класа маюць магчымасць вучыцца роднай мове. Апошнім часам у школе былі нават створаны інтэграцыйныя класы, што дало магчымасць вучыцца беларускай мове і дзеткам-інвалідам. У час, калі іншыя бельскія школы падобнага ўзроўню сутыкнуліся з вялікім паніжэннем колькасці навучэнцаў, гэты крызіс толькі ў невялікай ступені крануў „тройку". Беларуская школа заваявала вялікае прызнанне мясцовага насельніцтва дзякуючы высокаму ўзроўню навучання і прыхільнай атмасферы вакол вяртання да сваіх традыцый, гісторыі і роднай мовы.

Гімназісты і вучні падставовай школы з „тройкі", лаўрэаты і фіналісты ваяводскіх элімінацый прадметных конкурсаў

Поспехі на прадметных конкурсах і на завяршальных экзаменах

— Ад васьмі гадоў на завяршальным экзамене нашы белгімназісты набіраюць самую вялікую колькасць балаў з ліку ўсіх гімназічных школ у горадзе і знаходзяцца намнога вышэй сярэдняга паказчыка ў Бельскім павеце, Падляшскім ваяводстве і нашай краіне. Калі гаварыць пра вучняў нашай падставовай школы, дык сем гадоў перамагалі яны ў завяршальным экзамене, так як гімназісты, і толькі ў мінулым годзе занялі другое месца ў Бельску. Аднак на гэты вынік меў уздзеянне таксама фактар, што ў нас працуюць інтэграцыйныя класы, дзе вучацца дзеткі, якіх узровень навучання — ніжэйшы, — заяўляе дырэктар „тройкі" Васіль Ляшчынскі. — Мы робім акцэнт на працу са здольнымі і вельмі здольнымі вучнямі і больш чым трэцяя частка вучняў IV-VI класаў падставовай школы (87 асоб на агульны лік 241) і амаль палова гімназістаў (153 на агульны ліку 327) прыступілі ў гэтым школьным годзе да прадметных конкурсаў. Арганізавалася вельмі маштабная пазаўрочная праца з дзеткамі і моладдзю, а з іх ліку ажно 34 вучні з падставовай школы і 63 гімназісты вытрымалі адбор у раённыя элімінацыі прадметных конкурсаў.

Зараз ужо вядома, што сярод гэтых асоб вучні падставовай школы 9 разоў сталі лаўрэатамі ваяводскіх адбораў прадметных конкурсаў (усе, якія дайшлі да ваяводскага этапу). Бельскія белгімназісты ажно 16 разоў сталі лаўрэатамі прадметных конкурсаў і 5 разоў фіналістамі ваяводскіх спаборніцтваў. Здольныя вучні, якія дабіліся поспехаў у прадметных конкурсах, кажуць, што галоўны рэцэпт на поспех — гэта вучоба.

Бася Карыцкая стала лаўрэатам па беларускай мове і біялогіі. Па беларускай мове лаўрэатамі сталі яшчэ Ева Шкода, Марта Юрчук, Альжбета Коршак, Анна Андрусевіч, Анна Селевановіч, Патрыцыя Супранюк, Аляксандра Міранюк і Агнешка Андраюк, а фіналістамі — Паўліна Верамчук і Рафал Маркевіч. Некаторыя гімназісты сталі ўжо лаўрэатамі па беларускай мове ў мінулых гадах і ў гэтым годзе змагаліся па іншых прадметах. Па біялогіі лаўрэатамі сталі яшчэ Аляксандра Ігнацюк, Данеля Філіманюк, а ў гістарычным конкурсе звання лаўрэата дабіўся Дам'ян Козлюк. Фіналістамі сталі яшчэ Аркадзь Божка (па фізіцы) і Аляксандра Барбара Томчук (па геаграфіі).

— Біялогію я люблю з дзяцінства, а беларуская мова, гэта няйначай як свая, — коратка кажа Бася Карыцкая і дабаўляе, што ўмее таксама размаўляць па-свойму.

Іншыя гімназісткі, якія сталі лаўрэатамі па беларускай мове, кажуць, што ў асноўным вучацца ў III „д" класе. Яны любяць заняткі па беларускай мове і хочуць паступіць у Бельскі белліцэй. Дзяўчаты ўмеюць гаварыць на гутарковай мове, якая захавалася ў падбельскіх вёсках.

Лаўрэаты прадметных конкурсаў з падставовай школы

— Трэба ведаць сваю мову. У нашым III „д" класе ёсць толькі некалькі асоб, якія ўвогуле не ўмеюць гаварыць па-свойму. Галоўны недахоп, калі гаворым па-свойму, гэта малы запас слоў і тады ў час размовы ўкідваем польскія словы. Мы на сваёй мове гаворым і з бацькамі, але ў асноўным з бабулямі і дзядулямі, — заяўляюць згодна пераможцы прадметнага конкурсу па беларускай мове.

Зразумела, што ў час размоў са старэйшымі людзьмі дзяўчаты не карыстаюцца часткай лексікі, якая патрэбна ў размовах з бацькамі, а тым болей з сяброўкамі. У такіх выпадках трэба, каб бацькі дапамаглі дзецям навучыцца лепш гаварыць на роднай мове.

Мінулагоднія гімназісты Давід Яблушэўскі і Магда Якуц, зараз вучні белліцэя, за поспехі ў прадметных конкурсах і вельмі добрую вучобу ў „тройцы" атрымліваюць стыпендыю маршалка ваяводства. Цяперашнія вучні „тройкі" Агнешка Панасюк і Іаанна Марчук, таксама за мінулагоднія поспехі, атрымліваюць стыпендыю бурмістра Бельска. Затое ўсе вучні, якія дабіваюцца поспехаў у прадметных конкурсах або ў вучобе (у якіх сярэдняя ацэнка вышэй 5,5) атрымліваюць узнагароды дырэктара школы ў канцы школьнага года.

— У мінулым годзе ў мяне сярэдняя ацэнка склала 5,94, бо па фізкультуры атрымала я пяцёрку (па ўсіх апошніх прадметах — шасцёркі — А. М.), — гаворыць Агнешка Панасюк, сёлетняя лаўрэатка геаграфічнага конкурсу і фіналістка конкурсу па польскай мове. — Я асабліва многа дома не вучуся, ну, крыху больш, чым іншыя. Калі рыхтуюся да заняткаў, то тры разы чытаю апошні матэрыял у сшытку і кніжцы. Адкладваю іх і ўжо больш не заглядваю, каб паўтараць.

Аляксандра Гаўрылюк, лаўрэатка конкрсу па польскай мове і біялогіі кажа, што ў прадметных конкурсах прымае ўдзел ужо з падставовай школы. Сёлета рашылася спаборнічаць у двух конкурсах, бо якраз настаўніцы па гэтых прадметах заахвоцілі паспрабаваць пазмагацца.

Сярод вучняў падставовай школы лаўрэатамі па беларускай мове сталі Адрыян Іванюк (таксама лаўрэат па польскай мове), Каміль Сцепанюк і Наталля Грыгарук. Яны завяралі, што любяць вучыцца беларускай мове і лепш або горш умеюць гаварыць па-свойму.

— Каб дабіцца поспехаў па матэматыцы, трэба было рашыць многа задач і больш вучыцца, чым па гісторыі. Аднак па гісторыі трэба было многа чытаць, — кажа Іаанна Марчук з падставовай школы, сёлетняя лаўрэатка гістарычнага і матэматычнага, а раней і беларускага конкурсаў.

Ксеня Канстанцыя Дораш і Іаанна Нівінская кажуць, што ў іх сярэдняя ацэнка — 5,83. Іаанна стала лаўрэаткай па польскай і рускай мовах, а Ксеня дабілася звання лаўрэаткі ў гістарычным конкурсе (раней была лаўрэаткай па беларускай мове).

— Калі гаварыць пра польскую мову, дык я многа вучылася па граматыцы, але і чытаць трэба было, а па-руску я многа размаўляю з бабуляй, — заяўляе Іаанна, а Ксеня гаворыць, што рыхтуючыся да гістарычнага конкурсу трэба было запамятаць многа дат.

Яшчэ дошка і крэйда

— У нашай школе ставім на працу са здольнымі вучнямі, якіх ангажуем да работы ў пазаўрочных кружках. У час такіх заняткаў нашы дзеткі і моладзь рыхтуюцца да прадметных конкурсаў і развіваюць свае зацікаўленні. Мы стараемся заахвоціць вучняў да максімальнай працы па прадметах, якія іх цікавяць, бо без вялікай асабістай ангажаванасці вучняў не было б так вялікіх поспехаў. Вельмі важна, каб вучні хацелі вучыцца і рабілі гэта з прыемнасцю, — кажа дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Каб былі яшчэ большыя поспехі, патрэбныя сучасныя мульты- і інтэрмедыйныя дапаможнікі, а ў кожным класным кабінеце павінны быць камп'ютары, якія можна было б выкарыстаць на занятках. Тады вучні менш перапісвалі б і было б больш часу на практыкаванні. Зараз нашы настаўнікі ў час адукацыйнага працэсу ў галоўным абапіраюцца на дошку і крэйду.

Калі я пытаю вучняў, якімі дапаможнікамі карысталіся ў час падрыхтоўкі да прадметных конкурсаў, называюць яны падручнікі і матэрыялы, якія прынеслі ім настаўнікі. Інтэрнэт выкарыстоўваўся ў малой ступені. Апрача пазаўрочнай работы са здольнымі вучнямі, настаўнікі „тройкі" многа ўвагі адводзяць працы з менш здольнымі вучнямі, рэзультатам чаго з'яўляюцца добрыя вынікі на завяршальных экзаменах, як у падставовай школе, так і ў гімназіі.

Свае традыцыі, беларуская культура

— Мы на ўроках беларускай мовы, рэлігіі, у час іншых заняткаў з наймалодшымі дзеткамі і на пазаўрочных сустрэчах многа ўвагі прысвячаем сваім традыцыям і беларускай культуры. У нас чатыры вакальныя гурты беларускай песні і два танцавальныя калектывы, якія папулярызуюць народныя танцы. Два вакальныя калектывы вядуць Сяргей Лукашук і Іаанна Хількевіч, а наша настаўніца Анна Вярцінская вядзе два вакальныя і два танцавальныя калектывы. Анна Фіёнік і Марыянна Ваўрусевіч займаюцца з групай дзетак, якія рыхтуюць пастаноўкі з народнымі абрадамі, — пералічвае дырэктар Ляшчынскі.

Аднак „тройка" не жыве толькі поспехамі, але і сваімі праблемамі. Дырэктар Васіль Ляшчынскі звяртае ўвагу на фінансавыя складанасці і выхаваўчыя праблемы ў школе і ў агульным крытычна ацэньвае асветную рэформу.

— Я думаю, што гарадскія дзеткі справяцца, калі пойдуць у школу ў шасцігадовым узросце, але падзел былой падставовай школы на цяперашнюю падставовую школу і гімназію не апраўдаўся. Для многіх гімназістаў аўтарытэтам не з'яўляюцца ўжо ні бацькі, ні настаўнікі, а толькі іх сябры, а самыя вялікія выхаваўчыя праблемы якраз паяўляюцца сярод гімназістаў. Паводле мяне, падставовую школу трэба было б закончыць на цяперашнім пятым класе. Можна было б тады пакінуць тры класы гімназіі і зрабіць чатырохгадовыя ліцэі, паколькі зараз вучням цяжка за тры гады падрыхтавацца да матуральных экзаменаў. Цяперашніх вучняў трэціх класаў гімназіі трэба было б перакінуць у сярэднія школы. Дало б гэта станоўчыя рэзультаты, як адукацыйныя, так і выхаваўчыя, — разважае дырэктар Васіль Ляшчынскі.

Цяжкі кватарант

Пры вуліцы Аградовай у Бельску-Падляшскім жыве чалавек, які зносіць у сваю хату розныя рэчы са сметнікаў. Ужо нанасіў барахла столькі, што адзін пакой у хаце завалены аж пад столь, і калідоры таксама поўныя. У пад'ездзе смурод. Жыхары блёка баяцца, што развядуцца тут тараканы і пацукі. Скардзіліся ў бельскі жыллёвы кааператыў, які накіраваў справу ў санэпідэмстанцыю. Шкада, што санітарная служба адмовілася памагчы жыхарам — адаслала нейкую паперу назад у кааператыў, каб адчапіцца. Можа, калі б побач з гэтым чалавекам жыў працаўнік санэпідэмстанцыі, дык хутка б справу аформіў. Дзіўна, што такая ўстанова ўмее знайсці недахопы ў магазінах, рэстаранах і г.д., а тут не зацікавілася, каб дэзінфіцыраваць памяшчэнне. Кааператыў піша лісты кватаранту, а той і так сваё робіць. Перабраў старызну, крыху вынес для прыліку, але гэта кропля ў моры. І далей зносіць барахло дадому. Кааператыў не можа яго эксмітаваць, бо ўсё аплачвае. Псіхічна з ім штосьці не так, але ж да лекара яго сілай не завядзеш.

Як жыць з такім суседам? Няўжо няма на яго рады? У кааператыве сказалі, што можна яшчэ падаць на суседа ў суд. Але, мабыць, і ў судзе з ім не справяцца. Дык што застаецца суседзям прыкрага кватаранта?

Жэня МАРТЫНЮК

Лякарства на ўсе болі

Няма чалавека, які не скардзіўся б на боль. Аднаго пячонка мучыць, у іншага высокі ціск крыві, а трэцяга ў косцях ломіць. Сучаснай цывілізацыйнай хваробай з'яўляецца недастатковасць сістэмы кровазвароту. Фармацэўтычныя фірмы прыдумваюць новыя віды лякарстваў і прылад, каб толькі заманіць кліентаў. Самым папулярным стаў зараз універсальны апарат для масажу. Такую дабрадзейнасць прапанавала панечка з Новага Сонча. Завітала яна да мяне 2 красавіка. Незнаёмка адрэкамендавалася як прадстаўнік фірмы Centrum Badania Rynku BIONET і гаварыла, што праводзіць апытанне на тэму хвароб, якія выступаюць у вясковым асяроддзі. Перш-наперш запытала яна ці хварэў я на рэўматызм, пазваночнік і сістэму кровазвароту, ды якія лякарствы прымаў. А калі я прызнаўся, што якраз з гэтым маю праблемы, тады мне рэкамендавала апарат для масажу. „Цудатворны" апарат каштуе больш за пяцьсот злотых, але мне, як рэспандэнту, кампенсуецца затрачаны час і заплачу ўсяго палову цаны. Незнаёмка намагалася прадэманстраваць працу апарата, але я не праявіў гэтым зацікаўлення і мая субяседніца не солана хлябаўшы схавала яго ў ранец. Варта адзначыць, што некалькі аднавяскоўцаў-пенсіянераў паверыла ў цудатворны апарат ад усіх боляў і зрабілі заказы. Я ўжо апарыўся на банкавых прамоцыях і латвым прыбытку, затым не веру ў ніякія цуды.

Уладзімір СІДАРУК

Малыя шанцы на тое, каб так, як падобныя каталіцкія вышэйшыя навуковыя ўстановы, таксама і варшаўская Праваслаўная духоўная семінарыя магла атрымліваць фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту. Прынамсі няскора. Пакуль такіх магчымасцей не бачыць Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі...

Роўныя і раўнейшыя?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Малыя шанцы на тое, каб так, як падобныя каталіцкія вышэйшыя навуковыя ўстановы, таксама і варшаўская Праваслаўная духоўная семінарыя магла атрымліваць фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту. Прынамсі няскора. Пакуль такіх магчымасцей не бачыць Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі. Адзін з аўтараў сеймавага законапраекта ў гэтай справе, падляшскі дэпутат Яўген Чыквін заяўляе: „Сейму прыйдзецца адказаць на істотныя пытанні датычныя гарантаванага Канстытуцыяй раўнапраўя Касцёлаў і грамадзян".

Законапраект групы дэпутатаў (звязаных з Клубам лявіцы) аб фінансаванні Праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Варшаве з дзяржаўнага бюджэту трапіў у бюро маршалка Сейма яшчэ восенню мінулага года. Складваецца ён ледзь з двух пунктаў, з якіх першы, асноўны, гучыць: „Праваслаўная духоўная семінарыя атрымлівае датацыі і іншыя фінансавыя сродкі з дзяржаўнага бюджэту на прынцыпах акрэсленых для публічных вучэльняў, за выключэннем фінансавання коштаў рэалізацыі будаўнічых інвестыцый". У другім пункце сцвярджаецца, што закон меў бы прымяненне пачынаючы з 2010 бюджэтнага года. Значыць, як можна меркаваць, з 2010/2011 акадэмічнага года. Абгрунтаванне аўтары законапраекта пачынаюць са сцвярджэння: „Прынцып раўнапраўя Касцёлаў і іншых канфесійных згуртаванняў з'яўляецца першапланавай, канстытуцыйнай дырэктывай рэгуліроўкі канфесійных стасункаў у Рэчы Паспалітай". Далей гучыць папрок „прывілеявання дзяржавай каталіцкага вышэйшага школьніцтва", што мела яшчэ ў 2006 г. паглыбіць прыняцце Сеймам трох законаў аб фінансаванні з дзяржаўнага бюджэту на прынцыпах прадбачаных для публічных вучэльняў чарговых вышэйшых каталіцкіх установаў: Папскага тэалагічнага факультэта ў Варшаве, Папскага тэалагічнага факультэта ў Вроцлаве ды Вышэйшай філасофска-тэалагічнай школы „Ignatianum" у Кракаве, хоць такога абавязку не накладвае на дзяржаву Канкардат ад 1993 г. У кантэксце гэтых школ было прыкмечана: „Згодна з прынцыпам раўнапраўя Касцёлаў і канфесійных згуртаванняў такія самыя юрыдычныя ўмовы атрымлівання фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы павінны гарантавацца ўсім канфесійным згуртаванням у Польшчы, вядучым школы кандыдатаў на духоўных, а якія маюць статус вышэйшых школ. Такога роду асяродкам з'яўляецца дзейнічаючая бесперапынна з 1951 г. Праваслаўная духоўная семінарыя" [на стацыянарным і завочным аддзяленнях вучыцца тут 80 студэнтаў — М. Х.]. І далей: „гэта вышэйшая тэалагічная вучэльня, якая прысвойвае выпускнікам прафесійнае званне ліцэнзіята праваслаўнай тэалогіі. Гэтае званне раўнаважнае прафесійнаму званню прысвойванаму дзяржаўнымі вышэйшымі навуковымі ўстановамі. Пасля завяршэння трохгадовай навукі ў семінарыі яе выпускнікі могуць працягваць вучобу ў Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі". Згодна з законапраектам, гадавыя выдаткі з дзяржаўнага бюджэту на ПДС склалі б... 400 тыс. зл. (на думку дэпутата Чыквіна каля 700 тыс. зл.: „прапарцыянальна да ліку вернікаў абодвух Касцёлаў").

Толькі ў палове сакавіка міністр навукі і вышэйшага школьніцтва праф. Барбара Кудрыцкая пераслала праект пазіцыі Рады Міністраў наконт дэпутацкага законапраекта ў гэтай справе пад абмеркаванне ўрада. Ужо на пачатку тае пазіцыі, да якой „Ніве" ўдалося дайсці неафіцыйным шляхам, заяўлена: „Урад Польскай Рэчы Паспалітай у прынцыпе падтрымлівае ўвядзенне датацый для Праваслаўнай духоўнай семінарыі, асабліва ў святле канстытуцыйнага прынцыпу раўнапраўя Касцёлаў. Аднак, на думку ўрада, дэпутацкі законапраект не павінен быць перададзены для далейшых прац. Заадно так з-за фармальных недахопаў, як і ў сувязі з неабходнасцю папярэдняга ўвядзення адпаведных юрыдычных вырашэнняў у прынцыпы, якія рэгулююць сістэму польскага вышэйшага школьніцтва ды акрэсліваюць прынцыпы функцыянавання Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы". На думку міністэрства навукі, каб варшаўская семінарыя магла разлічваць на дзяржфінансаванне, трэба змяніць закон аб стасунках дзяржавы з ПАПЦ ад ліпеня 1991 г. Апрача таго не дазваляе гэтага закон аб вышэйшым школьніцтве ад ліпеня 2005 г. Прытым, па меркаванні міністэрства, званне прафесійнага ліцэнзіята праваслаўнай тэалогіі, якое прысвойваецца выпускнікам ПДС, „не з'яўляецца раўнаважным прафесійнаму ліцэнзіяту назначанаму дзяржаўнымі вышэйшымі школамі", як заяўляюць аўтары законапраекта.

Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі прапануе два шляхі вырашэння гэтага пытання: увядзенне ў закон ад ліпеня 1991 г. запісу, які прызнаваў бы студэнтам ПДС правы студэнтаў публічных вучэльняў, або заключэнне ўрадам і Святым Саборам Епіскапаў „дамовы, якая рэгулюе пытанні вядзення Праваслаўнай царквой вышэйшых школ ды акрэслівае статус студэнтаў вышэйшых школ, падобна як мела гэта месца ў выпадку каталіцкага вышэйшага школьніцтва". На канец пазіцыі гучыць сказ: „да законапраекта не была прадстаўлена пазіцыя Святога Сабора Епіскапаў у справе праектаванага юрыдычнага акту". Айцец мітрафорны Юры Дарашкевіч з мітрапаліцкай праваслаўнай канцылярыі ў размове з „Нівай" заявіў:

— Асобнай пазіцыі Сабора Епіскапаў у гэтай справе не будзе. Гэта справа, якой павінна займацца назначаная для вырашання праблем дзяржавы і нашай Царквы Супольная група прадстаўнікоў Урада РП і Святога Сабора Епіскапаў.

Тым часам дэпутат Яўген Чыквін заяўляе: „Я асабіста не супраць падтрымкі дзяржавай традыцыйнай для канкрэтнага грамадства сістэмы каштоўнасцей — у Польшчы, дзе каля 90 працэнтаў грамадства дэкларуе сябе католікамі, вядома, з'яўляецца ёй каталіцызм. Побач католікаў жывуць тут, аднак, людзі іншых веравызнанняў, таксама і няверуючыя. Наша Канстытуцыя сцвярджае, што ёсць вышэйшая норма: „Касцёлы і іншыя канфесійныя згуртаванні з'яўляюцца раўнапраўнымі". Цяжка прадбачыць, якое будзе канчатковае рашэнне Сейма наконт праваслаўнай вучэльні. Таго, што каталіцкія вышэйшыя вучэльні грошы атрымаюць, можна спадзявацца.

Дружба народаў

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Удзельнікі ў скансэне мазураў

— Якія ў цябе стэрэатыпы наконт маёй асобы? — пытаецца Паліна.

— Ніякіх, — адказваю, а яна глядзіць на мяне пытальным зрокам. — Мы ж размаўляем упершыню, — дадаю.

— Ну, праўда, а наконт рускіх людзей? Што думаюць палякі?

— Я ж беларуска, — адказваю ды чакаю працягу.

— Ты харошая дзевушка, — усміхаецца Паліна. — А як гэта атрымалася, што вы сюды прыехалі?

Як гэта атрымалася, што мы туды паехалі? Звычайна. Пазнаёмілі, дык з'явіліся. Мы, значыцца я, сяброўка і сябра з беларускіх моладзевых арганізацый на Падляшшы паехалі прадстаўляць беларускую меншасць на міжнароднай сустрэчы нацыянальных меншасцей паўднёва-ўсходняй Польшчы ды Карэліі. Цікава, атрымалася так, што было трох беларусаў, восем украінцаў ды дзевятнаццаць карэлаў. Ніякай раўнавагі, можа і таму складана было размаўляць на тэму меншасцей у Расеі.

— У нас всё хорошо, — кожны раз адказвала жанчына з міністэрства нацыянальнай палітыкі рэспублікі Карэлія.

„Што яна тут робіць?" — думалі мы з першага дня. Такое ж пытанне паставіла мне і сяброўка з літоўскай меншасці, якую наведалі мы ў час адной з экскурсій. „У нас чыноўнікі даўно не ездзяць на такія сустрэчы", — дадала са здзіўленнем. Нас таксама гэта здзіўляла, але хутка пачалі думаць пра жыхароў Расеі меркамі ў адваротных прапорцыях да гэтага, пра што яна расказвала.

— У нас няма ніякіх сварак паміж нацыянальнымі меншасцямі, — расказвала. — У нас вельмі талерантная дзяржава. Калі ўязджаеш у Маскву, зразу бачыш вялікія білборды з прамоцыяй талерантнасці.

— Можа вам патрэбныя білборды прапарцыянальна да ўзроўню недахопу талерантнасці сярод жыхароў Расеі? — спытаў мой сябра.

Гэта збянтэжыла нашых карэльскіх суразмоўцаў. На шчасце хутка нам трэба было ісці на вячэру і дыскусія вярнулася на кругі свае, пра недахоп бліноў на стале і колькасць бутэрбродаў на заўтрашнюю экскурсію.

Сустрэчу арганізавалі Фонд „Радова" і Міжнародны цэнтр сустрэч моладзі. У рамках праекта „Усход — Усход", фінансаванага Фондам Баторыя, запрашаюць у Камп Радова прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей з Усходняй Еўропы. У гэты раз арганізатары прыйшлі да вываду, што варта сустрэць у адным месцы меншасці з розных краін. Працаўнікі Фонду „Радова" раней пазнаёміліся з карэламі ў Пскове, дзе нехта падказаў, што вось у Карэліі пражывае многа меншасцей. Паверыце ці не, але сярод 716 тысяч насельніцтва Карэліі можна знайсці 150 нацыянальных ды некалькі рэлігійных меншасцей. Сталіца рэспублікі, Петразаводск, налічвае 280 тысяч жыхароў і гэта сапраўднае мульці-кульці. Гэта выклікала ў нас вялікае здзіўленне, але зразу і прыйшло нам у галаву, што вопыт у меншаснай палітыцы там сапраўды вялікі. Нашы думкі, аднак, хутка выпраўлялі самі карэлы.

— У нас ніякія стэрэатыпы не існуюць, не ведаю пра ніводныя, — сказаў адзін малады кандапожскі валанцёр.

Як гэта магчыма? Усюды існуюць нейкія стэрэатыпы. Калі аднак мы ездзілі на аўтобусе на ўсялякія экскурсіі, кожны раз карэльскі армянін расказваў анекдоты і жарты пра сваю нацыю.

— Дык ёсць у вас нейкія стэрэатыпы? — пыталіся мы пасля такіх расказаў. У Андраніка не было ніякіх сумненняў.

Пакідаю аднак тэмы пра стэрэатыпы ці талерантнасць, бо і ў час сустрэчы не прынеслі яны ніякага выніку. Расейцы засталіся пры сваёй палітыцы, мы глядзелі на справы ўжо больш з заходняга пункту гледжання. Самі гэтаму здзіўляліся, асабліва калі прыйшлося нам браць у абарону італьянцаў, якія кожны раз кіраўніком выбіраюць падазроную асобу Сільвіа Берлусконі. Размовы часам працягваліся вечарам у клубе „Мульці-кульці", але там трэба было чакаць прынамсі пару банак піва, каб нашы госці крыху раскрыліся і адышлі ад картачных гульняў ці іншых з роду „Правда или действие", у час якіх не цікавілі іх нашы штодзённыя справы, а хутчэй тое, дзе мы займаліся сексам. Нягледзячы на пікантнасць нашых сустрэч з карэламі, з дыстанцыі магу сказаць, што мы шмат чаго даведаліся пра нашых гасцей. Пазнаць самую Карэлію было вельмі цікава, бо не толькі глядзелі мультымедыйныя прэзентацыі ці паштоўкі, але і шмат часу слухалі пра дзейнасць усялякіх цэнтраў моладзевай культуры. Даведаліся, дзе варта паехаць па турыстычных мэтах, бо гэта якраз вельмі прыгожы куток Расеі. Госці паказалі нам свае скансэны ды распавялі пра заводы, якія заснаваў яшчэ цар Пётр I. Пазнаёміліся мы з акцыямі, якія праводзяць у Петразаводску яўрэі, немцы, літоўцы, армяне ці палякі. Пазналі моладзевыя выданні і ініцыятывы, якія праяўляюць маладыя людзі.

— У нас ёсць і шмат беларусаў, — шапнула мне жанчына з міністэрства. — Пазней раскажу, — дадала.

Так і мы сустрэліся пазней.

— У нас пражывае 37 тысяч беларусаў! — працягвала. — Была адна вялікая беларуская арганізацыя, але зараз, на жаль, яна прыспала. Падышоў затое да нас у дэпартамент малады чалавек, які сказаў, што ён спявае, танцуе і хоча заснаваць моладзевую арганізацыю. Мы не маем нічога супраць. Нядаўна паўстала таксама невялікая арганізацыя беларусаў у іншым раёне, магчыма будзе шанс аб'яднаць іх пасля ў адну вялікую аўтаномію.

Аўтаноміяй называюць у Расеі, а прынамсі у Карэліі, грамадскія арганізацыі паасобных нацый. Спачатку не разумелі мы ў чым справа. Зараз думаю, што само слова аўтаномія дае пачуццё сапраўднай незалежнасці, нават калі гэта толькі арганізацыя і да гэтага пад кантролем нацыянальнай палітыкі. Дарэчы, вельмі прыемна было пачуць пра „сваіх" у Расеі. Тым больш, што ва ўспрыманні нашых карэльскіх сяброў мы таксама з Беларусі. Не памагла наша прэзентацыя, якую пачалі з малюнка карты паўднёва-ўсходняй Польшчы з візуалізацыяй месца, дзе жывуць беларусы ў Польшчы і тлумачэннем чаму якраз там. Ужо на другі дзень пасля адной-дзвюх банак піва чарговы прыезджы пытаўся, калі мы пераехалі з Беларусі ў Польшчу. Цярпліва мы тлумачылі ў чым справа, але з панядзелка да пятніцы пытанне паўтаралася. Махнулі мы на гэта рукою і сапраўды шчыра пасябравалі з украінцамі з польскага гарадка Гурова-Ілавэцкае. Аказаліся яны не толькі шчырымі і адкрытымі, але яшчэ і не казалі, што гаворым па-ўкраінску, да чаго прывыклі нас пераконваць падляшскія ўкраінцы. Тыя з паўночнай Польшчы падкрэслівалі, што ў нас зусім розныя мовы, але па менталь-насці мы вельмі блізка ды заадно вельмі далёка ад нашых братоў з Карэліі. Нам з гэтым было сапраўды камфортна. Жаль толькі аднаго. У развітальны вечар, калі ўсе супольна частаваліся шашлыкамі паармянску, да нашай гульні далучыліся палякі, студэнты гісторыі, якія працавалі пры другім праекце. Пачаліся сяброўскія размовы, у выніку якіх між іншым мой сябра даведаўся, што ён як беларус, ды як кожны іншы беларус, некрытычна імкнецца ў бок Расеі і Чырвонай Арміі, у якой ганарліва змагаліся за Савецкі Саюз нашы дзяды. Кулакі былі ўжо падрыхтаваны, але, як гэта бывае са стэрэатыпам беларуса, ён жа не будзе біцца за сваё! Сёння, аднак, не з-за сваёй ветлівасці, толькі дзякуючы розуму і талерантнасці.

„Ніва" таксама дапамагла

Пра патрэбу рамонту арыгінальнай вялікай драўлянай брамы з дашком пакрытым гонтай перад колішнім школьным будынкам у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) пісаў я ў „Ніву" і допіс быў надрукаваны 2 верасня 2007 года.

Дашок з кожным годам пападаў у руіну. У 1970 годзе недзе знікла брама. Рамонту дашка дамагаўся радны Янка Целушэцкі з Новага Ляўкова, ставіў справу па сесіях Гміннай рады ў Нараўцы.

І вось радасная вестка: дашок адрамантавалі (!) і ён ёсць аздобай вёскі Старое Ляўкова. Пра гэты факт загаварылі жыхары Ляўкова, Лешукоў, Плянты, Ахрымоў, Капітаншчыны. Усе яны задаволеныя. І дадам, што варта ведаць пра гэта, што матэрыял на новы дашок купіў за свае грошы Андрэй Мядзведзь, старшыня Гміннай рады ў Нараўцы.

Лёсам дашка ў Старым Ляўкове вельмі цікавіўся верны чытач „Нівы" Уладзімір Клімюк (ён раней быў таксама карэспандэнтам нашага тыднёвіка) з Плянты. Ён чакаў гэтага і дачакаўся.

Беласток

Апошні на лініі „13"

Апошні прыпынак аўтобусаў гарадскога транспарту на лініі № „13" у Беластоку знаходзіцца ля цяпліцы па вул. 27 Ліпеня. Адсюль 1 км да Саўлян. Цяпер дашок-віята на гэтым прыпынку амаль што непрыгодны для карыстання. Ён увесь са шкла, а яно, як вядома, нетрывалае. Зараз у дашку і ў бакавых сценках хуліганы павыбівалі шыбы. Яна і паламалі лавачкі.

Схавацца тут ад ападкаў снегу або дажджу нялёгка, можа толькі ў куточку, дзе адна-другая шыба ацалела, яна так-сяк чыпіць у жалезнай раме. Па ўсім відаць, што кіраўнікі гарадскога транспарту ды гарадскія ўлады не дбаюць пра дашкі на перыферыі. Гэтая віята на канцавым прыпынку на вул. 27 Ліпеня зусім іншая ад навейшых. Яе пабудавалі шмат гадоў таму. Неяк падумалася мне, што лік „13" прыносіць няшчасце і няўдачу. Бо ці ж не так? На апошнім прыпынку аўтобусаў лініі „13" натрапіў я на дашок-разваліну. Так хацелася б, каб гэтай вясною яго адрамантавалі або разабралі і прывезлі сюды новы.

Гайнаўка

Новыя газетна-часопісныя кіёскі

Фірма „Рух" паставіла новы прыгожы вялікі кіёск з газетамі ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая. Неўзабаве такія арыгінальныя і вельмі функцыянальныя малыя крамы будуць пабудаваны па вул. Пілсудскага і ля скрыжавання вул. 3 Мая і кс. Верабея.

Цешыць факт, што вядомая фірма „Рух" развіваецца і дбае пра свае кіёскі. У іх больш за 50 гадоў прадаюць наш беларускі тыднёвік „Ніву".

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Прыйшла вясна

Дашкольнікі з Мельніка рыхтаваліся да першага дня вясны. Дзеткі выступалі з вясновымі вершамі і песнямі, яны гукалі каляровую пару года. На сцэне з'явілася мноства касцюмаў-прадвеснікаў: кветкі, зялёныя лісточкі, сонейка, матылькі, пчолкі... Гульні дапамаглі засвоіць змены, якія адбываюцца ў прыродзе. Самі дзеці сказалі:

— Мы прагналі матулю-зіму і клікалі вясну, наступную пару года.

Настаўнікі і бацькі задбалі пра грым і вясёлы настрой, які, дарэчы, адчуваецца ў вершы:

Вясна-красна,
Залатая каса!
Прыходзь, вясна,
З белай хмаркаю
І прыпаркаю,
З травой-муравой,
З птушыным граем —
Мы цябе чакаем,
Вельмі чакаем!

І хаця ў прадшколлі не выкладаюць беларускай мовы, Оля (на здымку) усё разумее, бо бацькі і бабуля дзяўчынкі размаўляюць у хаце па-беларуску.

Альжбета РАМАНЧУК

Фота КАНСТАНЦІНА МАРТЫНЮКА

Міра ЛУКША

Кажан з Кажан

Ніхто добра так не чуе,
як кажан, калі палюе.
— Рукакрылы, — кажа, — я!
Кажуць: мыш лятучая!
Гладканосы і паўсцісты.
Я харошанькі і чысты!
Крылы доўгія, а вушкі —
натапыраныя слушкі.
Хто зімуе пад страхою,
а хто ў Аўстрыю зімою
ці ў Румынію імкнецца,
каб схавацца ці пагрэцца.
Кажаноў у Кажанах
летам, кажуць, проста — страх!
Ды не кожнаму кажан
бачан ды і распазнан!
Бо кажан — начны ён князь.
Хоць не хрушч ты — не падлазь!
Ліставёрткі, шаўкапрады,
вусачы... — вось ён тым рады.
Даўганосікі, агнёўкі,
пядзенікі, молі, соўкі... —
усё, што шкодзяць у Кажанах —
вось на іх наводзіць страх
той кажанскі шарсцюшок!
Начны рыцар — кажанок.

„Смяшынкі" для маладых і дарослых!

Дарагія сябры! Сёння прапануем вам „Смяшынкі" Віктара Шведа. Наш сябра-паэт выдаў аб'ёмісты том вершаў, аздобленых прыгожымі, каляровымі малюнкамі (мастачка: Таня Місіюк). Многія з вершаў друкаваліся ўжо ў „Зорцы", аднак у кніжцы чытаюцца яны інакш, больш поўна, больш выразна. Падборка, якую прапануе нам аўтар, своеасаблівая гульня са словам. Аўтар гуляе вядомымі сцвярджэннямі, афарызмамі, прыказкамі, прымаўкамі, народнымі павер'ямі... Героямі вершаў з'яўляюцца дзеці, іх бацькі і дзяды, жывёла. Паэт апісаў іх цёпла і сардэчна. Праўда, многія з вершаў патрабуюць інтэлектуальнай спраўнасці. Амаль кожны верш мае ў сабе загваздку, мараль, часам нечаканую развязку.

Як піша ва ўступным слове прафесар Тэрэза Занеўская, «варта таксама падкрэсліць у „Смяшынках" аптымізм, дзякуючы якому перамагаюць тут заўсёды „дарогі сэрца" і любві чалавека. Многа вершаў, якія знаходзяцца ў гэтым зборніку, забаўляючы пераказваюць адвечныя праўды — аб важнасці дружбы, аб мізэрнасці багацця, якое не прыносіць шчасця, аб веры ў дабро, а таксама ў тое, што шчасця чалавек мусіць шукаць у сабе самім».

Хоць зборнік адрасаваны маладому чытачу, яго з карысцю і прыемнасцю могуць прачытаць дарослыя. Вершы не толькі рассмешаць і асвежаць памяць! Іх можам прачытаць уголас сваім малышам і тым самым выказаць у іх і свой адрас заўвагі. Напрыклад, пра імкненні наконт вынікаў у вучобе, канкрэтна пра пасведчанне з чырвоным паяском:

Пасведчанне якое
Ты атрымаў, Лявоне?
Ці нейкае благое,
Ці з паяском чырвоным?
Пасведчанне ў школе
Атрымаў, вядома.
А паяском да болю
Дастаў ад бацькі дома.

Кніжку выдала літаб'яднанне „Белавежа". Яе можна набыць у нашай рэдакцыі, у час аўтарскіх сустрэч, а таксама выйграць у якасці ўзнагароды ў конкурсах „Зоркі". „Смяшынкі" Віктара Шведа — цудоўны валачобны падарунак.

ЗОРКА

Дэкламатары з Бабікаў

Фота Ганны КАНДРАЦЮК



Зося з першага „а” класа

— 25 —

У канцы сакавіка дзень у дзень ішоў снег. Здавалася, зіма будзе цягнуцца круглы год. Усе выглядалі сонца і цеплыні...

Нарэшце, 1 красавіка, з самай раніцы засвяціла сонца. Калі Зося адплюшчыла вочы, яна падумала, што гэта жарт, звязаны з *Prima Aprilis*. Аднак калі яна выйшла з хаты, паверыла ў яркае сонца. З-за гарачыні дзяўчына скінула плашч.

У класе таксама адчуваўся подых вясны. Хлопцы думалі як падмануць нейкага настаўніка. Ахвярай стаў іх выхавацель Янка Рыбачук. Пеця прыдумаў, што іх клас пойдзе на ўрок гуманістаў з першага „ф”, тыя — на ўрок фізікі да Янкі Рыбачука. Усім задума спадабалася.

Вучні з першага „а” не прадбачылі, што ўрок гісторыі павядзе прафесар Вольга Сваяк. Жанчына была здзіўленая, калі пабачыла новых вучняў, але нічога не сказала. Першыя дзесяць хвілін настаўніца гаварыла пра сярэднявечча ў Нямеччыне. Вучні ледзь паспявалі за яе думкай, бо на сваіх уроках яны толькі што закончылі старажытны Рым. Пасля Вольга Сваяк пачала выклікаць да адказу ля дошкі. Першы *пад нож* пайшоў Тамаш Вярбіцкі. Хлапец не ведаў адказаў на пытанні.

— Кажуць, ты інтэлігентны хлапец, — пачала іранізаваць настаўніца, — і многа гавораць пра твае шырокія зацікаўленні. Бачу, што не маеш уяўлення пра сярэднявечча. Што ж... прыйдзецца паставіць табе адзінку.

— Прабачце, але... я не ваш вучань, — пачаў тлумачыцца Тамаш. — Заняткі гісторыі вядзе ў нас спадар Іванюк!

— Ведаю, — адказала спакойна спадарыня Сваяк, — таму зараз пайду паскардзіцца дырэктару. Хай выкіне з нашага ліцэя такіх неабавязковых вучняў і дрэнных настаўнікаў гісторыі, якія не ўмеюць пераказаць моладзі ведаў.

— Не! — крыкнуў Пеця. — Гэта я вінаваты, гэта я прыдумаў такі „жарт”.

Вольга Сваяк паабяцала, што не паставіць адзінкі і не пойдзе да дырэктара. І што ўся гісторыя гэта такі яе... „жарт”!

У адрозненне ад нашых сяброў першы „ф” клас быў захоплены новым настаўнікам. Янка Рыбачук нават не прыкмеціў, што вядзе ўрок у чужым класе. Ён быў вельмі рады, што мае такіх разумных і абавязковых вучняў. Шкада, што больш не сустрэнецца ён са сваімі выдатнікамі...

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Наша Наста

Існуюць у музыцы жанры, пра якія шмат не чуваць у сродках масавай інфармацыі. Перад усім таму, што яны з'яўляюцца некамерцыйнымі, альтэрнатыўнымі да таго, што звычайна чуем ва ўсялякіх радыёстанцыях. Часта бывае так, што нестандартны фольк, джаз ці фолькджаз можам паслухаць у паасобных перадачах, якія наогул выходзяць у эфір тады, калі нам ужо хочацца або і трэба спаць. Таму дзем тут месца для так таленавітых, надзейных і даволі арыгінальных выканаўцаў.

Наста Някрасава гэта дзяўчына, якую фанаты беларускай музыкі пазналі дзякуючы песні „Дажджамі” гурту :Б:Н:. Пасля гэтага яе кар'ера на беларускіх сцэнах пачала развівацца. Але да гэтага — ужо ў 1999 годзе — стала лаўрэатам Фестывалю маладых талентаў фолькджаза „Зямля пад белымі крыламі” ў Мазыры. З гэтага моманту прайшло 10 гадоў, але зараз Настка сваімі здольнасцямі захапляе журы перш за ўсё польскіх фестываляў. Яна перамагла на „Фолькавых Мікалайках” у Любліне. Пасля ўзяла гран-пры фестывалю „Sounds of Borderland”. У чэрвені 2008 года вакалістка вырашыла заснаваць свой асабісты гурт „Наста Някрасава” і ўжо два месяцы пазней разам дэбютавалі на фестывалі „Вольнае паветра”. Неўзабаве магчыма акажацца, што яна стане зоркай польскіх медыяў, на што зусім нядаўна разлічвалі, мабыць, хлопцы з гурту „Далі”. Наста супольна з гуртом „Folkroll” увайшлі ў фінал конкурсу ладжанага Польскім радыё. Фестываль „Новая традыцыя” пройдзе ў Варшаве з 23 па 26 красавіка, а конкурсныя выступы зможам пабачыць 24 красавіка дзякуючы трансляцыі ў TV Polonia і ў II праграме Польскага радыё.

Варта сачыць за мастацкім развіццём Насты Някрасавай, бо яна прэзентуе вельмі цікавы музычны напрамак. Беларуская аўтэнтычная песня становіцца цікавай і актуальнай для сучаснага слухача, дзякуючы хаця б джазавым інтэрпрэтацыям бубнача, спалучаным з уплывамі этнічных матываў ці гукам ф'южн, якія плывуць з бас-гітары. Да гэтага цёплы, далікатны, і заадно востры голас Насткі. Няхай канкурэнцыя баіцца!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 15

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 11:

Смак, порт, як, пах, авал, ял, вясёлка, газета, кіт. Соя, кава, ас, вяз, пасеў, палёт, мох, лак, як, талант.

Узнагароды, навейшую **кніжку Віктара Шведа „Смяшынкі”**, выйгралі **Уршуля Васілюк** з Новага Корніна, **Дагмара Крупа, Юстына Тамашук, Агата Грыгарук** з Дубін, **Ева Галёнка** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



У Таварыстве беларускай культуры ў Літве адзначылі 91 угодкі БНР

Тэкст і фота Алеся АДАМКОВІЧА

Усялякае паняволенне пачынаецца з забароны мовы.

Ралан Барт

28 сакавіка 2009 г. у Вільні ў Таварыстве беларускай культуры ў Літве адбылося святкаванне 91-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. Яшчэ адна гадавіна разважанняў і падсумаванняў над пройдзеным шляхам растаптанае, зняважанае і ўкрыжаванае дзяржавы.

25 сакавіка было абвешчана аб нараджэнні новай дзяржавы. 25 сакавіка Анёл Габрыель засведчыў аб прыходзе на грэшную зямлю Божага Сына, таго, хто быў растаптаны, зняважаны і ўкрыжаваны. А пасля цераз цярністы шлях Божы Сын адрадзіўся да новага, слаўнага і велічнага жыцця. І гэтыя паралелі часта наводзяць на думку аб адраджэнні нашае святое Бацькаўшчыны. А пакуль Краіна 25 сакавіка ў XXI стагоддзі застаецца ў душах і сэрцах сваіх грамадзян і чакае свайго ўваскрэсення.

У гэтае найвялікшае і радаснае нацыянальнае свята кожны раз са смуткам і болем даводзіцца канстатаваць, што Беларусь так і застаецца паняволенай дзяржавай: нішчыцца яе архаічная мова, культура, традыцыі, памяць, зневажаецца ўсё, што беларускае. І гэтае ўсё робіцца пад маўклівую згоду саміх беларусаў, з памяці большасці якіх ужо выцерты дзеі мінулага і галасы сваёй зямлі і заглушаны акупацыйнымі. Таму большасць ведае герояў не свае зямлі і ганарыцца чужымі, моліцца не сваім багам. Віры XX стагоддзя вельмі балюча прайшліся па Беларусі, якую практычна зруйнавалі дашчэнту. І яна павінна была б паўставаць з гэтых развалін, але ўкрыжаваны лёс працягваецца.

Але той 25 Сакавік перамагае. Аб ім ужо ведаюць. І ён стаў не толькі святам беларускае эміграцыі, але і шырока адзначаецца ў самой Бацькаўшчыне. І сёння большасць сходзіцца на той думцы, што без Беларускай Народнай Рэспублікі не было б і сённяшняй Беларусі. Тады бальшавікі пайшлі на стварэнне БССР толькі таму, каб схіліць беларусаў на свой бок, прынамсі іх раскалоць і не даць магчымасці беларусам аб'яднацца вакол БНР. Так было тады, так ёсць сёння...

Пасля выканання нацыянальнага гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" старшыня ТБК Хведар Нюнька зачытаў зварот прэзідэнта БНР Івонкі Сурвілы да беларускага народа.

На імпрэзе ў Таварыстве было шмат гасцей як з Літвы, так і з Беларусі. Ва ўсіх выступоўцаў гучалі словы занепакоенасці сённяшняй сітуацыяй і надзеі на адраджэнне Беларусі і вяртанне яе да нацыянальных і дэмакратычных каштоўнасцей.

Краіна згубленых мараў і ў той час краіна вялікай надзеі — такой выглядае наша Святая Бацькаўшчына.

Аб лёсе малавядомага беларускага каталіцкага святара і паэта Казіміра Сваяка (кс. Кастуся Стаповіча) распавяла спадарыня Наталля Мяшкова. Ён быў адным з тых, хто спрычыніўся да Акта 25 сакавіка 1918 г. Так, ён не прымаў у гэтым непасрэднага ўдзелу, але быў адным са стваральнікаў нацыянальнай ідэі беларусаў, за што шмат цярпеў ад польскага каталіцкага духавенства. Да канца сваіх дзён заставаўся верным сваім ідэалам і верыў у адраджэнне Беларусі. Ён спачывае ў Вільні на Росах разам са сваім братам Альбінам Стаповічам і шматлікімі беларусамі-віленчукамі, што пакінулі свой след у гісторыі нашага народа. *Ідзе вось ясная пара / Правіду свеціць нам зара / Айчына, маці Беларусь, Гарой жыва!* Гэта радкі з яго верша, якія сталі эпітафіяй на ягоным надмагільным помніку.

Выступае старшыня „Бацькаўшчыны" Алена Макоўская

У зале ТБК 28 сакавіка 2009 г.

На 10 гадавіну яго смерці паэт Міхась Машара напісаў верш, у якім змешчаны не толькі словы ўдзячнасці, падзякі калегу і беларусу, але асэнсаванне і ацэнка жыццёвага шляху Казіміра Сваяка:

Я прыйшоў табе пакланіцца,
Рана змоўклы, наш слаўны паэт.
Ад ваколіцаў роднай зямліцы
Прынашу табе ціхі прывет.
Хоць ты змоўк і хоць ліра разбіта,
І хоць новыя страты баляць —
Над краінай туманам спавітай
Тваіх песняў акорды звіняць.

Прыйдзе час і гэтае імя зойме належнае месца ў айчыннай гісторыі.

На святкаванне быў запрошаны Аляксандр Казулін, які падзяліўся сваімі думкамі адносна далейшага шляху Беларусі. Яго вельмі непакоіць тое, што адбываецца сёння. Перш за ўсё — паводзіны Еўропы да Лукашэнкі. Сёння, калі ёсць палітычныя вязні, калі збіваюць дэманстрантаў, калі забараняюць беларусам адзначаць свае нацыянальныя святы, Еўропа не толькі маўчыць, але спрабуе легалізаваць гэты рэжым. Яна вядзе з ім перамовы на фоне збіцця моладзёвых актывістаў, часова прыпыняе санкцыі супраць чыноўнікаў і вось-вось запросіць Лукашэнку на саміт у Прагу (так яно і атрымалася — аўт.). Наперадзе ідзе прагматызм і інтарэсы бізнес-класа — так адзначыў прамоўца. Перамагае не розум, а прагматызм. І праблема, відаць, не ў Лукашэнку, а ў той сістэме, якую ён стварыў — у лукашызме. І Еўропа сёння яе прымае. І прыезд Лукашэнкі ў Прагу гэта не вырыванне яго з абдымкаў Расеі, а легалізацыя. І атрымліваецца, што за тыя 15 год дыктатуры, за зніклых людзей, за збітых дэманстрантаў і вязняў сумлення ніхто не адкажа і на гэта закрыюць вочы. Аляксандр Казулін вельмі шкадаваў, што ў сённяшнім свеце замест сэрца і пачуццяў перамагае прагматызм. І прычыны сёняшняга крызісу не эканамічныя. Яны ў дэмаралізацыі грамадства, разбурэнні сямейных, сяброўскіх адносін, калі ўсё вымяраецца грашыма, а не духоўнасцю. Казуліна вельмі непакоіць яшчэ і той факт, што беларуская апазіцыя ніяк не можа аб'яднацца і сесці за стол перамоў, бо сёння толькі разам можна перамагчы дыктатуру, адкінуць усе свае „я" і амбіцыі і рабіць агульную справу на карысць Беларусі.

Аб адным з нацыянальных рамантыкаў і аб пошуку сваёй ідэнтычнасці ў XIX ст. на прыкладзе Станіслава Манюшкі распавёў Аляксей Фралоў. Чалавека XIX ст. цікавіла хто ён. І там пачынаўся пошук сябе і разумення сваёй тутэйшасці. У Вільні ёсць мемарыяльная шыльда ў гонар С. Манюшкі як польскага кампазітара. І вось, як зазначыў прамоўца, побач з ёй трэба і такую, што ён і беларускі кампазітар. І гэта зусім не азначае, што яго трэба адбіраць у палякаў, ці перайначваць гісторыю. Проста — ён яшчэ і беларускі кампазітар. Манюшка да канца не знайшоў сябе і, нягледзячы на тое, што вельмі шмат зрабіў для польскай музыкі, шмат зрабіў і для беларускай, якая гучыць у яго матывах. Яшчэ Рыгор Шырма адзначаў, што слухаючы Манюшку, ён чуе галасы Міншчыны і Случчыны (адкуль быў родам кампазітар).

Лідар Маладога фронту Зміцер Дашкевіч распавёў аб дзейнасці гэтага моладзевага аб'яднання. Таксама і ў яго гучалі думкі занепакоенасці склаўшайся сітуацыяй, аб тым, што апазіцыя раз'яднаная і, магчыма, прыйшоў час ёй зысці ў адстаўку. Зусім няшмат засталося сярод іх лідараў, якім можна давяраць.

Раман Вайніцкі (кіраўнік клуба „Сябрына"), які родам з Вішнева і быў ахрышчаны знакамітым беларускім ксяндзом Уладзіславам Чарняўскім, падкрэсліў аб значнасці свята 25 Сакавіка, згадаў віленскіх беларускіх „зуброў", якія дапамаглі яму стаць беларусам.

З найвялікшым беларускім нацыянальным святам прысутных павіншаваў першы амбасадар Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі Альфонс Аўгуліс. Ён, між іншым, зазначыў, што беларусам сёння трэба аб'яднацца і быць разам. Беларусы і літоўцы жылі заўжды побач і сёння часам цяжка адрозніць, дзе літоўскае, дзе беларускае. Сёння не трэба дзяліцца, а быць разам. Трэба памятаць тое месца, дзе ты нарадзіўся і дзе ты жывеш і адносіцца да іх з павагай і любоўю. Суседзяў, як і бацькоў, не выбіраюць, яны даюцца. І літоўцы шчаслівы, што маюць побач такіх суседзяў як беларусы.

Ад самакіравання г. Вільні павіншаваць беларусаў прыехала Рэната Лісоўская-Урбановіч. Яна распавяла аб тым, як ідзе праца па стварэнню культурнага цэнтра Якуба Коласа ў Вільні. Варта нагадаць, што ТБК і самакіраванне г. Вільні выступілі заснавальнікамі згаданага цэнтра.

Старшыня Рады Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" Алена Макоўская зазначыла, што свята 25 Сакавіка неабходна было б пераводзіць з палітычнага кантэксту ў народны і адзначаць яго разам як нацыянальнае свята і не праводзіць у гэты час палітычных акцый. І вельмі добра, што ў дыяспарах яно адзначаецца як найвялікшае беларускае свята. Вельмі хацелася б, каб гэтак было і ў Беларусі.

Ніна Шыдлоўская распавяла аб падрыхтоўцы да V З'езда беларусаў свету. Вельмі прыкра, што ўлады ўсяляк гэтаму перашкаджаюць. Нават на сённяшні дзень не знойдзена памяшкання для яго правядзення. А вельмі хацелася б, каб ён адбыўся ў Беларусі.

На заканчэнне бард Алесь Камоцкі агучыў свае творы, а вучаніца другога класа школы Ф. Скарыны — Ксеня Мілаш — парадавала ўсіх беларускімі песнямі.

На дадзены момант адна з самых актуальных праблем — гэта індэнтыфікацыя беларусаў, захаванне іх нацыянальнай саматоеснасці. Калі ідзе нахабная і ўжо непрыхаваная русіфікацыя, паўстае вострая праблема выжывання нацыі. І супрацьстаяць ёй можна толькі разам, толькі аб'яднаўшыся. Гэта асноўная думка, якая гучала ў часе святкавання чарговай гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, нацыянальнай дзяржавы беларусаў, абвешчаныя ідэалы якой чакаюць свайго часу...

Чэслаў Неман: творчасць у імя цывілізацыі!

Язэп ПАЛУБЯТКА

Ураджэнцаў нашага краю, што воляй абставін пакінулі родны край ды сталі гонарам другой краіны, не пералічыць: герой грамадзянскай вайны ЗША Тадэвуш Касцюшка, нацыянальны герой Чылі Ігнацій Дамейка, губернатар Гаваяў Русел Судзілоўскі, бацька амерыканскай касманаўтыкі Барыс Кіт і многія іншыя.

Прыхільнікі „чыстай польскасці" папракалі яго за ўсходнекрэсавы акцэнт, якога не пазбавіўся на працягу жыцця, але ў гадзіну пахавання ўсе радыёстанцыі Польшчы ў гонар вялікага спевака і музыкі перадавалі твор, якім у 1960-х гадах паўстаў супраць кансерватыўных спеваў і тым праславіў краіну. Гэта была кампазіцыя «Dziwny jest ten świat» («Дзіўным ёсць гэты свет»). Таксісты Варшавы на некалькі хвілін спынілі рух і развіталіся працяглымі сігналамі. Песня гучала на вакзалах і ў крамах паўсюдна ў краіне.

Пра Чэслава Юліюша Выдрыцкага напісана-пераказана шмат, адшукаць нешта новае з жыцця і творчасці амаль немагчыма, але паўстала нагода ўзгадаць пра гэтую асобу яшчэ раз. Дзве даты, якія прыпадаюць на пачатак 2009 года з розніцай у адзін месяц: пяць гадоў з гадзіны смерці і семдзесят з дня народзінаў.

Карані

Месца нараджэння шмат хто лічыць сваім. Раней вёска Старыя Васілішкі належала да Лідскага павета. Аднак у дзень яго з'яўлення на свет 18 лютага 1939 года гэта Наваградскі павет. Зараз яна ў межах Шчучынскага раёна. Што датычыць самога паселішча, то яно старадаўняе. Легенду паходжання не аднойчы распавядаў сам Чэслаў:

— Заснаваў князь Васіль (пэўна, Вайшалк), які з першых прыняў хрысціянства ў гэтым краі. Да канца XIX ст. тут стаяў драўляны касцёл. З літасці Мікалая II пабудаваны новы. Паўстаў у неагатычным стылі. Да фундацыі пабудовы прычыніўся Леанард Іваноўскі, бацька дзяржаўных дзеячаў Беларусі, Літвы, Польшчы пачатку XX ст. Касцёл вытрываў бальшавіцкі атэізм і сёння дзейнічае. У ім у гонар фундатара і касцельнага спевака Чэслава Выдрыцкага, мемарыяльныя дошкі.

Маленства, вайна, спевы і навучанне

Бацька з дробнай шляхты. Быў майстрам на ўсе рукі; акрамя вядзення сельскай гаспадаркі мог наладзіць фартэпіяна, адрамантаваць гадзіннік і г.д. У хаце былі розныя музычныя інструменты. Як сведчыў сам Чэслаў, у маленстве яго забавай было ціснуць клавішы.

Ваеннае ліхалецце засталося па-за памяццю з прычыны ўзросту, аднак у памяць урэзаўся адзін эпізод, калі ў 1944 годзе ўцякалі немцы, а ён з сястрою сядзеў у акопах.

Бацька не змірыўся з акупацыяй краю бальшавікамі, затым немцамі. Ад пачатку — шараговец Арміі Краёвай. Да справы прыцягнута сям'я. Сястра Ядвіся насіла кабуры ў лес да акаўцаў, што шыў бацька.

Новы прыход саветаў Чэсік сустрэў пяцігадовым хлапчуком. У польскай

школе ніколі не вучыўся. У савецкай не стаў ні піянерам, ні камсамольцам. З малога спяваў у касцёле. Пазашкольнае музычнае навучанне скончылася са смерцю ксяндза на пачатку 1950-х. Касцёл быў зачынены. Юнак паступае ў Гродзенскае музпедвучылішча па класе домры, але праз год выключаны за пропускі заняткаў, бо часта з'язджаў дамоў.

Ужо ў Гданьску (Польшча), куды пераехала на сталае жыццё сям'я, навучаўся ў музычнай школе па класе фагота.

Ад'езд

Выдрыцкія з'ехалі ў Польшчу, калі Чэсіку мелася быць 19 гадоў. Ён сцвярджаў, хто прычынай таму стала нежаданне служыць у савецкім войску, але гэта бадай адна з іх. Бацька акавец, якога карная бальшавіцкая сістэма да пары да часу не кранула. Стварыліся калгасы і гаспадар пазбавіўся зямлі, што была сродкам існавання. Зачынены касцёл, як традыцыйны асяродак маралі і культуры. У сям'і не ўспрынялі чужыя каноны. Нагодай ад'езду стала дамоўленасць кіраўніка ПАРП Гамулкі з савецкім урадам аб вяртанні палякаў на радзіму. Патрэбай дамоўленасці была неабходнасць засялення зямель, што па заканчэнні вайны адышлі да Польшчы: частка Прусіі і гданьскае Паморʼе. Сям'я пераехала ў Белагард, што на паморскіх землях. Неўзабаве памірае бацька і жыццё запатрабавала самастойнасці.

Шлях да Алімпа і постаць

Напачатку 1960-х гадоў працуе докерам, малюе шыльды і грае. Нягледзячы на задаткі мастака, спевы перамаглі. Першым крокам да сусветнай славы стала кампазіцыя „Ведаю, што не вернешся", якая мела поспех у парыжскай Алімпіі ў 1963 г. Чэславу Выдрыцкаму толькі 26 гадоў.

Неўзабаве новы твор „Ці ты яшчэ памятаеш?" Прызнанне Еўропай Немана поўнае, бо гэтую кампазіцыю неўзабаве з уласным тэкстам выканала Марлена Дзітрых. Ён становіцца самым вядомым артыстам Польшчы па-за яе межамі. Моладзі цывілізаванай Еўропы абрыдлі састарэлыя нормы паводзін. Перад імі з'явілася асоба, якая не ўпісваецца ў тыя рамкі і паступае згодна свайго разумення. Чэсік са Старых Васілішак — прадвеснік маладзёвага бунту еўрапейскага маштабу 1968 года.

Бацькі, касцёл далі падставу стаць музыкам і спеваком, але дух творцы прымусіў пераступіць парог „гжэчнага" выхавання. Ён першы за „Бітлз" паўстаў супраць цывілізаванай і пабытовай заскарузласці. Паўстаў не толькі тэкстамі сваіх песень, але манерай апранацца і паводзіць сябе.

Даўгавалосы, лахматы, апрануты ў квяцістую кашулю ды яшчэ, як вясковец-беларус, у паўкажушку. Ад заходняй цывілізацыі ўпадабаў шматлікую біжутэрыю. У такім выглядзе вольна мог з'явіцца ў людным месцы. Моладзі тое было да спадобы, але дарослыя ставіліся крытычна.

Слава прыйшла ў 1967 годзе, калі ён супольна з „Акварэлямі" на 5-м фестывалі ў Аполі выканаў уласную кампазіцыю „Дзіўны ёсць гэты свет", за што атрымаў спецыяльную ўзнагароду кіраўніка Камітэта па справах радыёвяшчання і тэлебачання.

Нягледзячы на тое, што шмат хто называў яго гарлапанам, патрабаваў сагнаць са сцэны — Неман паўстаў сімвалам новай польскай і сусветнай музычнай культуры. У 1960-х і 1970-х гадах шматразова прызнаваўся найпапулярнейшым вакалістам Польшчы ў апытаннях, якія праводзілі музычныя часопісы „Jazz" і „Non Stop".

Хоць неаднойчы казаў, што яго пераследуюць тагачасныя ўлады, усё ж яны (улады) шанавалі спевака, давалі магчымасць працаваць, як творцу і ўганароўвалі. У 1974 г. Неман атрымаў Залаты крыж заслугі. Яго творчасць адзначана ўзнагародай 1-й ступені Старшыні Савета Міністраў.

Палітра творчасці

Уласныя тэксты складаюць значную частку твораў, але ўжо будучы знакамітым зацікавіўся філасофскай паэзіяй. Падняў з нябыту Цыпрыяна Норвіда. Нават сцвярджаў, што з'яўляецца нашчадкам паэта. Выкарыстоўваў тэксты Асныка, Пшэрвы-Тэтмаера, Лесьмяна, Славацкага. Заўжды меў здольнасць даць непаўторна гучную назву твору. Акрамя вышэйзгаданых, можна назваць такія, як „Аднаго сэрца", „Кленчачы перад табой" ды іншыя. Калі тэкст кампазіцыі меў высокі філасофскі сэнс і не кожны слухач мог успрыняць тое, то музычнае суправаджэнне прыемна перабольшвала словы і дапасавала сведчанне густу. Паступова адыходзіць ад року. Распачаў музычныя эксперыменты. Выкарыстоўваў сінтазатары, электрафанічныя інструменты. Апошні дыск выйшаў у 2001 годзе „З-пад хмары капелюша". Аднак быў раскрытыкаваны, што вельмі засмуціла спевака.

Нягледзячы на тое, што музыка адымала шмат часу, не пакінуў малявання. У апошнія гады жыцця зацікавіўся камп'ютарнай графікай. У 2001 годзе частку сваіх прац выставіў на аўкцыён. Атрыманыя грашовыя сродкі перадаў Польскай гуманітарнай акцыі, на якія былі набыты адукацыйныя матэрыялы для школ Літвы.

Туга па Радзіме

Тыя, хто быў побач са спеваком сцвярджаюць, што ён вельмі часта ўспамінаў Старыя Васілішкі. Аднак пасля ад'езду пабываў тут толькі аднойчы, у сярэдзіне 1970-х гадоў, калі выступаў з канцэртамі ў Мінску. Тады з сябрамі наведаў родную вёску. Пабачыў зачынены касцёл, пустую хату, парослы дзірваном падворак і занядбаны сад. Зафільмаваў гэта, але тут жа знішчыў касету. Болей жадання наведаць радзіму ў яго не ўзнікала.

Сям'я

Каханне з мадэллю пані Малгажатай паўстала нечакана. Яна — жанчына жыцця. Створана цудоўная сям'я. Выхаваны дзве дачкі — Наталі і Элеанору. Чэслава дзеці шанавалі не толькі як вялікага артыста, але болей як бацьку. Толькі мала каму вядома, што першай яго жонкай была дзяўчына з Васілішак. Гэта пытанне даследаваў адзін карэспандэнт. Яна — першае школьнае каханне Чэслава. Маладзейшая ад яго на два гады. З Польшчы Чэслаў выслаў ёй запрашэнне і неўзабаве яны ўзялі касцельны шлюб. Час не просты. Ён працуе, спявае. Яна навучаецца на курсах медсясцёр. У 1960 г. у іх нараджаецца дачка. У палове 1960-х гадоў яны разышліся. Была дамоўленасць, што ён не будзе называць яе імя. Таму засталася ананімнай.

Значнасць творцы

Творы непаўторныя, індывідуальныя. Аднак ёсць кампазіцыя, якая найбольш яскрава перадае сутнасць творчасці Немана. Гэта „Эпітафія. Памяці Пятра". Яна паўстала з сумнай нагоды смерці ўдзельніка гурту, бубнара, якога не стала ў 23-гадовым узросце ад лішняга ўжывання наркотыкаў. Уражваюць апошнія радкі твора: „Пад жалобны звон/ Стоячы ля свежачасанага крыжа/ Звяртаюся да цябе цывілізацыя". Звяртаецца ён з пякучым болем у сэрцы з нагоды „недарэчнай смерці чалавека".

Сусветна знакамітая асоба паўстае хадайнікам перад сусветам з нагоды смерці простага чалавека. У тым бачыцца планетарны сэнс жыцця кожнага беларуса на чужыне.

Спачын і памяць

Апошнія гады цяжка хварэў, але ў лякарню ісці не пажадаў. Лячыў сябе ільняным семем.

Памёр Чэслаў Неман 17 студзеня 2004 г. Пахаваны на варшаўскіх Павонзках, у калумбарыі. Жалоба з нагоды смерці вялікага беларуса паўстала не толькі ў Польшчы. На другі дзень пасля смерці Старыя Васілішкі наведаў лідскі гурт „Крэсавякі" і іншыя прыхільнікі яго творчасці на Беларусі. У гадавіну смерці беларускія і польскія артысты ў памяць аб Чэславе Немане зладзілі ў Лідзе канцэрт. Такія ж імпрэзы адбыліся ў Гродзенскім дзяржаўным музычным каледжы і іншых беларуска-польскіх асяродках. Рэжысёр Яўгеніюш Шпакоўскі зняў дакументальны фільм „Чэслаў Неман".

Мясцовыя ўлады выказалі намер у доме, дзе нарадзіўся Чэслаў Неман, стварыць музей у гонар вялікага спевака. Аднак пакуль пажаданне застаецца пажаданнем, бо і па сённяшні дзень аб тым афіцыйнае рашэнне не прынята.

І немаверная памяць аб ім засталася ў яго творах.

Як святкуе беластоцкая моладзь

Штогод пішам пра святкаванні Акту 25 Сакавіка ў школах Гайнаўкі і Бельска. Сёлета падпытаў я гімназістаў і ліцэістаў з Беластока, якія вучацца беларускай мове і ўдзельнічаюць у беларускай алімпіядзе, прадметных конкурсах па беларускай мове і ў іншых беларускіх спаборніцтвах, як яны адзначаюць сакавіцкія святкаванні. Мае суразмоўцы адзначылі, што ў іх адукацыйных установах няма агульнашкольных святкаванняў гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Беластоцкія ліцэісты святкуюць 25 Сакавіка кожны па-свойму

Гімназісты з Беластока выступілі ў Гайнаўцы з канцэртам

— Мы жывем тым, што адбываецца ў Рэспубліцы Беларусь. У дзень 25 сакавіка мы па інтэрнэце правяраем як праходзяць святкаванні ў Беларусі і хвалюемся за людзей, якія з-за святкаванняў трапляюць там у няволю, — заяўляе гімназістка з Беластока Ганна Пякарская. — Мы ў Польшчы яднаемся ў думках з Беларуссю. Аднак вельмі добра, калі ў гэты святочны дзень беларусы з Падляшша могуць супольна сустрэцца і разам правесці час.

Беластоцкія гімназісты раней, у падставовай школе, вучыліся патрыятычных вершыкаў і рыхтавалі праграмы ў гонар сакавіцкіх святкаванняў пад кірункам сваёй настаўніцы Аліны Ваўранюк. Дзеткі і моладзь выступалі на агульнабеластоцкіх святкаваннях.

— У нашай Гімназіі № 7 у Беластоку беларускай мове вучыцца 21 асоба. Агульнашкольных святкаванняў у нас няма. Мы гаворым аб гістарычных падзеях 1918 года на ўроках беларускай мовы, успамінаем пра нацыянальныя беларускія сімвалы „Пагоню" і бел-чырвона-белы сцяг. У агульным нашы гімназісты ўжо вельмі многа ведаюць пра гісторыю Беларускай Народнай Рэспублікі і станоўча ўспрымаюць святкаванні ўгодкаў гэтых падзей. У асноўным на заняткі беларускай мовы прыходзіць моладзь, якая ўжо свядомая сваёй беларускасці, але зараз ёсць некалькі асоб, якія раней не вучыліся беларускай мове і яны знаёмяцца з гістарычнымі падзеямі ад асноў, — інфармуе настаўніца беларускай мовы Альжбета Рудкоўская.

Іаанна Васілюк, настаўніца беларускай мовы, якая вучыць гэтаму прадмету беластоцкіх ліцэістаў з розных школ у Агульнаадукацыйным ліцэі № 3 кажа, што яе вучні зарыентаваныя ў найважнейшых момантах гісторыі Беларусі і таму сакавіцкім святкаванням на занятках не адводзіць асаблівую ўвагу. Ліцэісты з беластоцкіх школ кажуць, што святкуюць угодкі БНР па-за сваімі адукацыйнымі ўстановамі.

— У ліцэі мы не святкуем 25 Сакавіка. Калі мы былі малымі дзеткамі, нашы бацькі бралі нас на агульнагарадскія святкаванні і мы хадзілі на іх несвядомыя падзей. З часам сталі разумець, што гэта за свята і кожны вучань, які ходзіць на заняткі беларускай мовы ў Беластоку, адзначае гэтае свята пасвойму, — гаворыць ліцэістка Оля Каліна. — Вучні, якія ходзяць на агульныя святкаванні ў Беластоку, робяць гэта ўжо свядома.

Оля раіць паразмаўляць з сяброўкай, якая ў мінулым годзе пабывала на сакавіцкіх святкаваннях у Мінску.

— Пабыўка на святкаваннях Дня Волі ў Мінску была непаўторнай. Мы былі на вялікім мітынгу, але наш знаёмы з Мінска дбаў, каб мы былі ў тых месцах, дзе не трапілі б на міліцыю. У гэтым годзе ў мяне матуральныя экзамены, але ў наступным годзе я хацела б паехаць ізноў на святкаванне ўгодкаў БНР у Мінск, — кажа Кася Кузьміч, ліцэістка з Гарадка, якая вучыцца ў Беластоку.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ЛІТВЕ

Беларускай дыяспары ў Літве можна пазайздросціць — далёка не кожны беларус мае магчымасць калі не штодня, то даволі часта наведваць Вільню — горад, які цягам стагоддзяў адыгрываў найвялікшую ролю ў культуры беларускай нацыі. Магчыма, менавіта гэты чыннік і ўплывае на падсвядомасць і самапачуццё літоўскіх беларусаў, якія стала дыхаюць водарам віленскай даўніны, што, відаць, і натхняе іх на руплівую і самаадданую працу на карысць беларушчыны.

Адной з праяў такой дзейнасці стаў сайт, што нядаўна з'явіўся ў інтэрнэце і з'яўляецца віртуальным прадстаўніцтвам Таварыства беларускай культуры ў Літве. Данае таварыства нязменна ўзначальвае Хведар Нюнька, вядомы сваёй адданасцю справе захавання і развіцця беларускай культуры і мовы.

Сайт месціцца па адрасе http://westki.info/tbk і выглядае даволі строга. Падаецца, што яго можна было б зрабіць крыху весялейшым, але гаспадары партала на даным этапе развіцця сайта, відаць, большую ўвагу надаюць выключна яго зместу, што зразумела. З цягам жа часу такі падыход да сайта мусіць быць зменены, канешне, у тым выпадку, калі яго аўтары і ўладальнікі захочуць прыцягваць да сваёй працы ўвагу ўсё большай колькасці інтэрнэт-карыстальнікаў. Дарэчы, многія рубрыкі партала пакуль знаходзяцца ў распрацоўцы.

Сёння сайт Таварыства беларускай культуры ў Літве (ТБК) мае традыцыйную пабудову з тым толькі выключэннем, што выйсці да рубрык месцяцца толькі зверху выяўлення, а цэлая старонка падзелена на дзве часткі. Штодзённай дзейнасці ТБК аддадзена большая, левая частка.

На першай старонцы месцяцца навінныя паведамленні, датычныя падзей звязаных з беларускай культурай і гісторыяй. Абнаўляюцца гэтыя навіны адносна часта, што сведчыць аб зацікаўленасці сяброў ТБК у данясенні інфармацыі пра хвалюючыя іх праблемы і падзеі ўсяму свету.

Правы бок выяўлення толькі часткова інфармацыйна належыць ТБК. Але менавіта тут мы можам найбольш падрабязна пазнаёміцца з дзейнасцю арганізацыі, дзякуючы артыкулу „Яны захоўваюць беларускі дух: Таварыству беларускай культуры ў Літве — 20!". „Ужо два дзесяцігоддзі гэтая арганізацыя руплівa шчыруе на ніве беларушчыны і яе захавання ў Літоўскай Рэспубліцы. Сёння так ёсць, што дарагая кожнаму беларусу Вільня з кожным днём усё больш і больш аддаляецца ад Беларусі і беларуская прысутнасць менш і менш заўважная ў гэтым Вечным Горадзе. І таму з кожным разам становіцца складаней захоўваць беларускі дух гэтага месца", — з горыччу распавядаецца ў артыкуле. Але гэта не значыць, што сябры ТБК склалі рукі. Згодна артыкулу, дзякуючы намаганням Таварыства, у Вільні ўсталяваны помнікі на могілках беларускіх дзеячаў, адкрыты мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя дзеячам беларушчыны, адчынена беларуская сярэдняя школа імя Францішка Скарыны. У Віленскім педагагічным універсітэце створана кафедра беларускай мовы. Таварыствам выдадзены не адзін дзесятак кніг, сабраны багаты архіў па гісторыі Беларусі і Літвы. І гэта, зразумела, далёка не поўны пералік спраў ТБК.

У той жа час, ёсць усе падставы спадзявацца, што даны сайт, калі цалкам завершыцца яго распрацоўка, будзе распавядаць аб культурніцкай дзейнасці літоўскіх беларусаў поўна і дэталёва.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Перадача эстафеты

Сімвалічна, што хакейны чэмпіянат краіны закончыўся 3 красавіка, а футбольны распачаўся на наступны дзень. Тым самым нібы была перададзена эстафета ад аднаго папулярнага віду да іншага, які таксама мае падвышаную цікавасць з боку заўзятараў.

Фінальная стадыя плэй-оф хакейнага першынства ператварылася ў сапраўдны трылер. Дастаткова сказаць, што ўпершыню ў гісторыі для выяўлення мацнейшага спатрэбілася правядзенне ўсіх максімальна прадугледжаных рэгламентам сямі матчаў. Цягам серыі „Гомель", прыхільнікі якога зачакаліся вялікіх перамог, быў наперадзе — 3-1, але астатняга кроку зрабіць так і не здолеў. Можна па-рознаму ставіцца да галоўнага трэнера „Юнацтва" Міхаіла Захарава і яго методыкі, але тое, што яго каманда мае сапраўды моцны спартовы характар, бясспрэчна. Зарослыя бародамі „юнакі" (традыцыя ці забабон не галіцца падчас фінальных гульняў) выявілі неадольную прагу стаць мацнейшымі і, выйграўшы запар тры паядынкі, урэшце святкавалі агульны поспех. Апошні бой вызначала неверагодная напруга — дастаткова сказаць, што лёс трафея вырашыла адзіная шайба, якую сталічныя хакеісты закінулі толькі ў другой палове трэцяга перыяду. Так што маем новага-старога чэмпіёна краіны — мінскае „Юнацтва".

А вось колішняму футбольнаму флагману — мінскаму „Дынама" пакуль толькі належыць вяртаць былую славу. Варона з куста, а іншая на куст — барысаўскі БАТЭ прыйшоў у лідары айчыннага футбола трывала. З гэтага гледзішча 19-ы чэмпіянат Беларусі, які стартаваў у мінулую суботу, абяцае быць надзвычай інтрыгуючым. Да дуэта асноўных спаборнікаў варта дадаць амбіцыі салігорскага „Шахцёра", якім кіруе ўдачлівы Юрый Вяргейчык. Зрэшты, калі прыгледзецца да ўзросту настаўнікаў каманд вышэйшай лігі, то можна адзначыць, што бальшыня з іх знаходзіцца ў веку 40-45 гадоў. Трэнерскі корпус за апошнія гады значна памаладзеў, а фінансавыя мажлівасці ў сувязі з эканамічным крызісам знізіліся. Прыкладам, сітуацыя з мінскім МТЗ РІПА, які страціў амаль увесь асноўны склад — найбольш тытулаванаму беларускаму трэнеру Юрыю Пунтусу давядзецца „ляпіць" зусім новы калектыў.

Першынство прагназуецца напружаным і з тае прычыны, што змаганне за выжыванне мае быць як ніколі зацятым. Відавочных аўтсайдараў не праглядваецца — на гэтым месцы можа апынуцца ледзь не палова клубаў лігі. Гэта „Смаргонь", „Мінск", жодзінскае „Тарпеда", мікашэвіцкі „Граніт", магілёўскі „Днепр". З іншага боку, канкураваць за бронзу таксама ў стане чатыры-пяць калектываў. Залічым сюды акрамя салігорцаў наваполацкі „Нафтан", брэсцкае „Дынама", „Віцебск", згаданы МТЗ. Цяжка прадказальныя сёння „Гомель" і гродзенскі „Нёман". Зрэшты, вынікі першага тура, які прайшоў у пагодлівы сонечны дзень, не зусім пацвердзілі прагназаваны расклад: „Віцебск" — „Тарпеда" — 0:1, „Граніт" — МТЗ — 1:2, „Нёман" — „Гомель" — 1:0, „Шахцёр" — „Нафтан" — 1:1, „Смаргонь" — „Дынама" Брэст — 0:1, БАТЭ — „Днепр" — 1:0, „Дынама" Мінск — „Мінск" — 2:1.

Галоўнай жа падзеяй мінулага тыдня стала выязная вікторыя зборнай Беларусі ў адборавым матчы над Казахстанам — 5:1. Пакуль гэтая самая буйная ў нашай гісторыі перамога (у значнай ступені нечаканая) у гасцях — толькі лакальны поспех. Сапраўдная цана яго будзе вядомая ўвосень. А бліжэйшы афіцыйны матч нацыянальная дружына згуляе 6 чэрвеня ў Гродне з камандай Андоры.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Родам з Дабрывады

У сям'і Якуба і Вольгі Яўдасюкоў з Дабрывады было трое дзетак: Надзея, Мікалай і Тамара. Гаспадарку мелі невялікую, але дагледжаную. Якуб збудаваў шыкарны дом, абсталяваў кватэру ды вывучыў дзетак. Усе трое атрымалі вышэйшую адукацыю. Надзея і Тамара сталі педагогамі, а Мікалай атрымаў званне доктара. Быў самым маладым навуковым працаўніком Варшаўскага політэхнічнага інстытута, які абараніў доктарскую дысертацыю. Кіраўніцтва інстытута высока ацаніла дасягненні маладога навукоўца і ў знак прызнання паслала бацькам ганаровую грамату. Мікалай часта выязджаў на навуковыя сімпозіумы за мяжу. У 1989 годзе падаўся ў Злучаныя Штаты. Калі ў Польшчы ўвялі ваеннае становішча, не змог вярнуцца дамоў. Застаўся працаваць у Амерыцы. Жонка засталася ў Варшаве (родам яна з Кляшчэляў). Мікалай моцна перажыў расстанне з сям'ёю. Пасля некалькігадовых хадайніцтваў аформіў жонцы дакументы на жыхарства ў Амерыцы. Па сённяшні дзень Яўдасюкі жывуць у ЗША. Мікалай штогод наведвае бацькаўшчыну, не забывае сястрыц. У мінулым годзе ўдзельнічаў у з'ездзе выпускнікоў Гайнаўскага ліцэя і стаў „зоркай" вечара.

Вось як сваё мінулае ўспамінае 71-гадовая Надзея Філіманюк (з роду Яўдасюк).

— Вучылася я ў Пачатковай школе ў Кляшчэлях. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Гайнаўцы. У 1954 годзе закончыла беларускі ліцэй. Паколькі я не падала заявы на вучобу ў вышэйшую навучальную ўстанову, прапанавалі пасаду настаўніцы. Першыя крокі ставіла ў Пачатковай школе ў Старыне. Дадаткова ўдзельнічала ў педагагічных курсах у Бельску-Падляшскім. Год там вучылася. У Старыне навучала польскай мове, геаграфіі і музыцы. Пасля шасцігадовай працы перавялі мяне ў Вульку-Тэрахоўскую. Навучала дзетак у I-IV класах. У гэтым часе паступіла на завочны факультэт рускай філалогіі ў Плоцку. Там закончыла двухгадовую Настаўнікую студыю, а потым атрымала і дыплом магістра. Спадзявалася я атрымаць пасаду выкладчыка рускай мовы ў Чаромсе, але свабодных штатаў там не было. Шэсць гадоў працавала ў школе ў Вульцы-Тэрахоўскай. Пры канцы 1966 года перавялі мяне ў чаромхаўскую „падставуўку". Па-ранейшаму вучыла дзетак малодшых класаў польскай мове, геаграфіі і музыцы, затым некалькі гадзін навучала беларускай мове. У палове 1970 года паслалі мяне на прафесіянальныя курсы рускай мовы пад Маскву, у горад Арол. Палякі ў гэтым горадзе збудавалі інстытут для настаўнікаў рускай мовы дзеля атрымлівання імі ведаў. Штогод з Польшчы падавалася туды сто сорак курсантаў, якія вывучалі васемнаццаць прадметаў, усе на рускай мове. У Чаромсе ў школе працавала я да 1986 года, затым падалася на пенсію.

Самая малодшая Тамара стала выдатным матэматыкам. Настаўніцкі шлях пачынала яна ў Пачатковай школе у вёсцы Чаромха, затым у Арэшкаве. Нейкі час узначальвала арганізацыю гайнаўскіх гарцэраў, затым працягвала настаўніцкую прафесію ў ПШ № 5 у Гайнаўцы. Кураторыя высока ацаніла кваліфікацыі Тамары Яўдасюк і назначыла яе метадыстам матэматыкі (візітатарам) у Гайнаўскім, Бельскім і Сямятыцкім паветах. Тамара з'яўляецца аўтарам двух падручнікаў па матэматыцы. У мінулым годзе падалася на пенсію. Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, з'яўляецца сакратаром Таварыства сяброў Кляшчэлеўскай зямлі.

У час размовы Надзея Філіманюк прызналася, што чытае шмат беларускіх кніжак і з'яўляецца адным з вядучых чытачоў у чаромхаўскай бібліятэцы. Ды і пра „Ніву" не забывае.

Уладзімір СІДАРУК

У Кляшчэлях на рынку

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

У апошні панядзелак сакавіка кірмаш у Кляшчэлях быў вялікі. Нягледзячы на ветраное і дажджлівае надвор'е, сабралася процьма народу. На пачатку расставілі латкі купцы з яблыкамі. Цэны даступныя, як на прадвесні: ад пяцідзесяці грошаў да паўтара злотага за кілаграм адборных, сакавітых фруктаў. Далей гандляры рэкамендавалі вопратку і абутак, гаспадарчыя прылады, харчовыя прадукты, нават бутэрброд з напіткам можна было купіць у аўтабары. Мяне цікавілі цэны сельскагаспадарчых пладоў і таму падаўся я ў канец рынку. Спыніўся пры фурманцы, гаспадар якой прадаваў лубін.

— Па колькі цэніце? — кідаю ў бок селяніна.

— Па чатыры злоты за кілаграм жоўтага і па залатоўцы за блакітны. Жоўты карчысты, на ўгнаенне добры, — паясняе гаспадар. — Блакітны паасобна і высока расце...

У ходзе размовы селянін выявіў, што ён з выходзіць Чахоў-Арлянскіх.

— Ад вас у Кузаве хлапец быў жанаты, — кажу. — Толік Данілюк, не жыве, памёр...

Загаварылі затым пра супольных знаёмых. Я цікавіўся навінкамі з Дубіцкай гміны, а суразмоўцу цікавілі ягоныя землякі, бо апрача згаданага яшчэ двух з Чахоў у Кузаве жанатыя. Паколькі я спяшаўся на цягнік, развітаўся са сваім субяседнікам і падаўся ў бок фурманак са збожжам і бульбай. Збожжа шмат было, менш пакупнікоў. Мяшанку для корму па сорак цанілі, столькі ж за авёс, жыта і пшаніцу. Бульбу скупшчык скупляў на машыну. Плаціў сорак злотых за цэнтнер. Гаварыў, што дамоў прыедзе, калі хтосьці больш хоча прадаць... Парасят нарасхват бралі. Па 400-450 зл. за парку цанілі, але выбар быў невялікі. Лепшых разабралі мігам, а гэтых па 400 зл. не было што ў рукі браць. Свіное мяса ўгару пайшло. За кілаграм жывой вагі трэба па пяць злотых, а нават і больш заплаціць. Я на рынку купіў часнок, бо трэба ў агародчыку пасадзіць. Сіноптыкі прадвяшчаюць сонечнае і цёплае надвор'е. Час цяпліцай заняцца...

Уладзімір СІДАРУК

Госці...

Нядаўна Трасцянку наведалі госці. Не ведаеце іх? Скажу вам, дарагія чытачы „Нівы" — гэта шаноўныя ромы, а ў нас кажуць: цыганы. Можа б мы і рады былі ім, калі б не адна загана ў нашых наведвальнікаў. Яны прыехалі нас проста абкрадаць!

Заходзілі ў хаты і прапанавалі куплю старых спадніц, вымалі плед, якім завешвалі жанчыну, каб не бачыла, што робіць другая цыганка. А тая другая перабіралася ў другі пакой у вядомай справе — шукала грошай. Як толькі ў хаце паяўляўся гаспадар, яны хутка ўцякалі і ад'язджалі самаходам далей. Наведалі такім чынам некалькі хатаў, але толькі ў адной удалося ім пажывіцца на лёгкія грошы.

Цікава, што гады ідуць, а цыганкі стасуюць той самы метад, што і 50 гадоў назад. У такую даўніну і мяне таксама хацелі абакрасці. Толькі Бог надзяліў мяне добрым слыхам і я пачула як скрыпнулі дзверы ў пакой! Я туды — а цыганка ўжо паспела адчыніць шафу. Дасталі яны ад мяне тады грымакоў у плечы і беглі з мае хаты без аглядкі. Тады яшчэ самаходаў не мелі!

Два гады таму ў нас па-суседску шнырылі па падворках. У аднае жанчыны забралі з панадворка чатыры курыцы і пеўня, а ў другое — двух індыкоў.

Думаю, што гэтыя госці ездзяць не толькі па Трасцянцы, але і па іншых мясцовасцях. Калі б я тады іх бачыла, то абавязкова запісала б нумар самахода і пазваніла ў паліцыю. Даволі ўжо нас абкрадаць — мы ж таксама меншасць, так як і яны, толькі беларуская, і не ездзім абкрадаць ромскае меншасці. Што на гэта скажа шаноўны Станіслаў Станкевіч?! Ці не трэба ўзяцца за выхаванне?!!

РУТА

Адгаданка



1. месца на беразе вадаёма для прычальвання суднаў, 2. мяккая частка хлеба, ягады, мякаць, 3. стан спакою, у якім знаходзіцца цела пад уздзеяннем роўных, процілегла накіраваных сіл, 4. прыхільнік пурызму, 5. вострая прыправа з горкага кораня, 6. першая жыхарка раю, 7. дрэва з гронкамі дробных гаркаватых аранжавачырвоных пладоў, 8. квадратны корань з дваццаці пяці, 9. дэталь з адтулінай для накручвання на шрубу, 10. з яго адраджаецца Фенікс.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — партугальская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 10 нумара

Ван, Верн, Ежы, Цітоў, цынік, Юон.

Рашэнне: **Не вер каню, жонцы і вінтоўцы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Яны сказалі Ганне: тут будзе манастыр

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ



Два тыдні ляжала Ганна з Рудкі нямоглая пасля гэтых відзежаў. А ў нядзелю, 29 сакавіка, узяла асвячаную ікону Іверскай Багародзіцы і паехала ў Дабрываду. Ікону паставілі ў месцы, дзе звычайна стаіць Распяцце — стаяла Яно, як належыць у страсны велікапосны час, пасярод маленькага храма, поўнага хрысціян. А цёмная постаць Ганны, якая папрасілася ў бацюшкі стаць большменш у гэтым месцы, якое наказалі на месца іконы, якая мае быць ад цяпер Багамаці Дабрывадскай, віднела за балюстрадай, леваруч, і ўсе вернікі ўзіраліся на гэтую кленчаўшую асобу ў цёмным. Ганна з Рудкі, шчырая хрысціянка, вядомая з блаславёнай Госпадам дзейнасці лекавання людзей і меншых іхніх братоў, прыйшла апавесціць дабрывадцам і іншым, што будзе тут, у гэтай вёсцы, стаяць манастыр. І будзе ён свяцілам на ўсю праваслаўную старонку, і будуць тут людзі падымацца на ногі, і празраць, і дзеткі нямоглыя паўстаюць з одра, і лоны маладзіц напоўняцца, і п'яніцы бяздумныя адумаюцца... Дух праваслаўных падымецца і заззяе...

Ганна спрабавала гэта прапаведаваць у храме, ціхім голасам папрасіўшы святара пасля службы ўзяць голас, але было гэта арганізацыйнай перашкодай. Пад храмам распазналі яе дабрывадцы, якім аздаравіла яна блізкіх. Пад халодным дожджыкам віталіся з Ганнай, дзякавалі ёй, слухалі.

— Спачатку гарэла — вялікае святло я ўбачыла, — распавядала пра бачанае Ганна. — Убачыла я „іх" двое, з кошычкамі, у храме, у Благавешчанне. Гэта ікона так ззяла. А не было ў храме нічога, ні прастола, ні абразоў. Спыталася: як жывяце? Яны адказалі: „Жывем мы добра, але за мяжою трэцяя то яшчэ лепш жыве!" — і пайшлі вось туды, за райскія дзверы. І такую хустку паказалі, блакітнага колеру, то адсланялі, то закрывалі. Думаю: куды ж яе пачаплю, што мне з ёю рабіць? „Мы прыйшлі з манастыра!" Я спахапілася. Бачу, іхнія кошычкі стаяць у царкве ў Дабрывадзе, у гэтым месцы, дзе я паказвала. Кажуць тыя: „Што ты будзеш сваёй вадою рабіці?!" (Ганна моліцца з вадою з Кнарыд). О, ідуць, бачу, сваю ваду нясуць. Гэты сон быў з аўторка на сераду. А з серады на чацвер зноў прыходзяць. Ідзе натоўп народу, усе мяне чапаюць. А перад імі такая шырокая дарога. Ідуць людзі, насміхаюцца. Я схавалася за дрэва. А Ён мяне схваць: „Ідзі!" А Ён такі малады, а валасы доўгія, і барада таксама. І паказвае мне: вось там ляжаць покатам старыя і дзеці. „А дзе іхнія мацеры? Хай заўтра да мяне прыйдуць! А ты не спрачайся, і не спор, і не адмаўляйся. Рабі так і так. Ідзі, Ганна!" Да мяне Ён з натоўпу народу выйшаў. А мне так моцна галава балела, — Ганна пасля ўбачанага тыдзень *немашчная* ляжала. Два тыдні не еўшы.

— Вы верыце пані Ганне? — пытаемся ў дзядзькі Васіля.

— Верую! Я ведаю, што ёй верую. Я быў у яе ў Рудцы, вазіў да яе сястру. Бацюшкі таксама ведаюць. І старасты жонка была ў Рудцы. А гэтая ікона Божай Маці „Нечаканая Радасць", што вы прынеслі, мела тут стаяць, дзе вы яе паставілі? Гэта копія з Гары Афон.

— Я ведаю, што будзе тут манастыр. Даць сюды манаха. Каб у вялікую пятніцу прайшоў пад плашчаніцай. Я назбірала на манастыр ужо тысячу злотых — дала мне тая, што ўжо не ўставала, і далажыліся з Яблачына. І тут будзе моц, будуць з гэтым месцам Ангелы і Ісус Хрыстос. Калі сашле Гасподзь Духа Святога, будзе так, як саслаў духа на сюю ікону. Сашле і манаха. Гэтая ікона тут сабе выбрала месца. Мела быць паміж Курашавам і Чаромхай. І будуць тут кулі кідаць, акуляры... Без пятнаццаці шэсць, хто ранічкай тройчы абыдзе дабрывадскую царкву з Гасподняй малітвай, з Ойча наш, можа надзеяцца на Божую дапамогу.

— А, можа, хто недастоен таго, каб убачыць і паняць? — задумваецца дзядзька Васіль. — Вы пытаецеся: ці вы бачыце, але ж большасць нічога не бачыць. Калі яму не дадзена, значыць, недастойны.

Моліцца Ганна: Каб Ты памагла! Палажы ім, Ісус Хрыстос, ручку пад галаву. Ты тут ёсць, Ты тут стаіш, на Цябе Гасподзь саслаў Духа Святога... І пашлі чада на тых, хто чакае.

Памалілася Ганна на цвінтары над хлебам малітвай *ка Хрысту Спасіцелю*, за ўсіх даўно ляжаўшых у бальніцах: *Ісцалі калекаў, кульгавых, сляпых, нямовых, а найбольш п'яніцам памажы. І тых дзецям ляжачым.* За духоўнае і цялеснае збаўленне моліцца. І дала хлеб святой Агафіі на паламанне між сабою, як рабілі гэта вучні Хрыстовы.

— Будзе тут манастыр, праз трыпяць гадоў.

— О, віэтэ бачылі, як з вас пасміхаліся, — кажа жыхарка суседняга з царквой двара, якая вярнулася яшчэ раз да Ганны. — Казалі: „О, канец свету прапаведуе!" А бацюшка што сказаў: *Ja tu rzadzę!* Я прыйшла, бо гэта цікава. І паверыла вам.

— Добра, што ўвогуле даў гаварыць, — спакойна кажа Ганна. — Адзін свяцітар не хацеў на маю просьбу крануць майго чала чашай пасля прычасця. А другі яму растлумачыў: ты не ведаеш, колькі Ганна дала залатовак і долараў на храмы і манастыры! (Ганна ўсё, што даюць ёй у падзяцы за аздараўленне ахвяроўвае на Царкву). Пасобце і вы, людзі, каб манастыр тут стаў.

12.04 — 18.04

(22.03. — 20.04.) Цяпер бярэ голас рамантычная частка твае натуры. Не паддасіся аднак ілюзорным салодкім слоўцам! Будзеш рашучы і адважны. Усе справы аформіш віртуозна. Моцныя псіхічныя сілы. А цела падлячы нетрадыцыйнымі метадамі.

(21.04. — 21.05.) Твая эратычная аўра вельмі моцная! Не аднаму завернеш у галаве! Шэф дае табе поле для паказу тваіх умеласцей. Ключавую размову з ім правядзі з 16.04. (да 20.04.). Усе сустрэчы з людзьмі з 11.04. (аж да 24.04.) будуць вельмі каштоўнымі.

(22.05. — 22.06.) Лёс спрыяе табе амаль ува ўсім, за што возьмешся. Выкарыстай шанц, бо твае мары маюць шанц здзейсніцца. Найбольшую падтрымку атрымаеш ад сяброў, якім можаш безагаворачна верыць. Некаторыя мэты можаце рэалізаваць разам; найлепшае супрацоўніцтва аж да 24 красавіка. А ў пары — магчымы скок у бок выйдзе табе бокам!

(23.06. — 23.07.) Зайдрасць партнёра падмацуе твой настрой. На працы канкурэнцыя не мае шанцаў пры табе. Хоць будзеш прымушаны выбраць — хата ці работа. Зоркі спрыяюць асабліва амбітным Ракам. Шалёны тэмп жыцця і стрэс разгрузі на прыродзе.

(24.07. — 23.08.) Энергія цябе проста распірае; мусіш знайсці для яе разгрузку. Да святаў крыху нуднавата, але пасля Соцна створыць сексцыль з прыносячым шчасце Сатурнам — адкрыюцца новыя магчымасці і ўбачыш просты шлях. І не будзеш такі крытыканскі.

(24.08. — 23.09.) Да новых знаёмых не адносся засур'ёзна, каб не расчаравацца. У фінансавых справах можа чакаць цябе нямілы сюрпрыз (пад канец месяца адробіш гэтую прыкрасць). Можа вырашыцца твой лёс у фірме або дачакаешся доўгачаканай весткі.

(24.09. — 23.10.) Усё адменіцца на 180 градусаў. Справы пойдуць як бура! Тое, што здавалася быць немагчымым, аказацца быць банальна простым. З 11.04 (да 24.04) не ўсе планы ўдасца зрэалізаваць; тое, да чаго ты рыхтаваўся ад нейкага часу, прыйдзецца адкласці. Былое можа вярнуцца як бумеранг.

(24.10. — 22.11.) Час 11-15.04. спрыяе сустрэчам, а таксама дамовам і прафесійным вызначэнням. Самотныя Скарпіёны могуць перажыць надта гарачую любоўную прыгоду. Старайся з нічым не спяшацца, бо вынікі могуць быць балючыя. Грошы выдавай з галавою.

(23.11. — 22.12.) Добра пойдзе табе ў інтарэсах, задбаеш аб усе дэталі і не дапусціш, каб штось адбывалася без твайго ўдзелу. У цяжкіх сітуацыях разлічвай на розум, бо інтуіцыя можа падвесці. 11-15.04. не слухай зласлівых калег, не злуйся, нават калі будзеш мець падставы. Тое, што маеш зрабіць заўтра, пачні сёння.

(23.12. — 20.01.) Маеш галаву да інтарэсаў! Твой козыр — умеласць хуткіх рашэнняў. Не прымушай сябе да таго, да чаго не надаешся, не падрыхтаваўся або на што не маеш ахвоты. Спачатку супакойся, пасля бярыся за праекты. Не кіруйся старымі прадпасылкамі.

(21.01. — 19.02.) Будзеш прадуктыўны і эфектыўны. 13-17.04. хуткасць дзеяння аказацца быць добрым дарадчыкам. Лепш спраўдзішся ў дзеяннях, у якіх трэба больш адвагі чым цярплівасці. У каханні не гуляй, пастаў на шчырасць.

(20.02. — 21.03.) З 11.04. (да 24.04) Венера гарантуе табе поспехі ў фінансах, шчасце і поспех у каханні. Будзь вельмі асцярожны і пазбягай рызыкі 13-17.04.: небяспечныя сітуацыі, пагроза дарожных аварый, раптоўныя хваробы. Рыбам са слабымі нервамі пагражаюць таксама высокі ціск, галаўныя болі, раны і пераломы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960